ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН ЗЛУЧАЙЦЕСЯ! פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַר־ניקט זיך! ПРОЛЕТАРИИ ВСЕХ СТРАН, СОЕДИНЯЙТЕСЬ! PROLETARJ

Адрэс РЭДАКЦЫІ І КАНТОРЫ
Менск, Пляц Волі № 17
1-шы паверх
тэл.: Сакратара—№ 478; Рэдактара—№ 769; Канторы—№ 244; Сэктара прамысловасьці—№ 615

XI ГОД ВЫДАНЬНЯ ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

№ 1 (3090) ЧАЦЬВЕР 1 СТУДЗЕНЯ 1931 ГОДУ

КОШТ НУМАР У КАП

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў і Савету Народных Камісараў Б. С. С. Р.

Бібліятэка Ім. Горкага
Ин. 2779
Бібліятэка імя Леніна
Бібліятэка „Беларусь" Публіч.
НЕ ПУБЛІКАВАЦЬ

Пад кіраўніцтвам ленінскай партыі ў бой за выкананьне праграмы 3-га рашаючага году сацыялістычнай пяцігодкі

Шчыльней шарэнгі вакол камуністычнай партыі і яе ленінскага ЦК

ЗАВЯРШЫМ ПАБУДОВУ фундаманту сацыялістычнай эканомікі

Трэці рашаючы год—год вялізарнейшых тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, год, які канчаткова спаманту падмурад сацыялізму, год, які вырашыць выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

Пралетарыят і працоўныя масы СССР уступаюць у 3-ці рашаючы год пяцігодкі з вялізарнейшымі дасягненьнямі, як у будаўніцтве сацыялістычнай прамысловасьці, так і ў калектывізацыі гаспадаркі. На аснове правільнай ленінскай генэральнай лініі нашай партыі мы дамагліся небачаных посьпехаў, небачанага размаху тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

На 1931 год партыя намячае яшчэ больш вялізарны плян, яшчэ больш высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, яшчэ больш высокія тэмпы разгортваньня прамысловасьці і сельскае гаспадаркі. Па ўсім Саюзе прамысловасьць павялічвае абём вытворчасьці на 45 проц., г. зн. амаль у паўтара разы. БССР—непарыўная частка СССР—пры дапамозе працоўных Савецкага Саюзу разьвівае сацыялістычнае будаўніцтва ў 1931 гаспадарчым годзе на 65 проц. больш у параўнаньні з папярэднім годам, што азначае значнае перавышэньне намёткі апошняга году пяцігодкі.

Новая хваля масавага прыліву бядняцка-серадняцкага сялянства ў калгасы дала магчымасьць апошняму пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) намеціць на 1931 год вялізарнейшы плян сацыялістычнай перабудовы вёскі: калектывізаваць да канца 1931 году ў сярэднім 50 проц. усіх сялянскіх гаспадарак, а па важнейшых зернавых раёнах ня менш 80 проц. Такім чынам, мы атрымліваем абсалютную перавагу сацыялістычнага сэктару над капіталістычным. Ажыцьцяўленьне гэтага вялізарнейшага пляну разгортны тавар,—як аг[illegible] прамысловасьці агентуры польскай [illegible] у 1931 годзе тарыят пад кіраўніцтвам [illegible]ловы фунцы маску са шпіёнаў [illegible] і шкодніцтва—саюзьнікаў шко[illegible] эканомікі.

[illegible] на [illegible]сталістычнага [illegible] ва ўмовах аб[illegible]вай барацьбы, ва ўмо[illegible] капіталістычнага аб[illegible]кружэньня. Капіталістычны сьвет ідзе да заняпаду. Жорсткі эканамічны крызіс паглыбляецца і нашыраецца. Усе афіцыйныя прамовы кіраўнікоў буржуазных дзяржаў, артыкулы адказных палітыкаў прасякнуты глыбокім пэсымізмам перспэктыў 1931 году. На гэтым фоне, на фоне паглыбленьня крызісу ідзе хуткае паляпшэньне пралетарыяту і працоўных мас у капіталістычных краінах.

Рэцэпт буржуазіі «заціснуць патужэй папружку і чакаць лепшых часоў» адкінуты пралетарыятам. На вуліцах буржуазных сталіц, на вуліцах вялікіх гарадоў, усюды, дзе згрупаваны масы рабочых, адбываюцца дэманстрацыі.

Хлеба і працы,—гучыць голас мільёнаў беспрацоўных, хлеба і працы—дамагаюцца яны рэвалюцыйным шляхам. Капіталістычны сьвет шукае выхаду з крызісу ў прыдушэньні рэвалюцыйнага руху ўнутры і падрыхтоўцы да новай імпэрыялістычнай вайны,—да ўзброенага нападу на СССР. Гэта падрыхтоўка асабліва яскрава выяўляецца на фоне заняпаду ўсёй капіталістычнай гаспадаркі, калі зачыняюцца фабрыкі вырабу прадуктаў шырокага спажываньня і растуць новыя фабрыкі ўзбраеньня.

Унутраная контр-рэвалюцыя — кулакі, нэпманы, шкоднікі, агэнты інтэрвэнтаў, адчуваючы сваю нямінучую пагібель, аказваюць шалёнае супраціўленьне разгортанаму наступу сацыялізму па ўсяму фронту на рэшткі капіталізму. Гэта знайшло свой яскравы адбітак у арганізацыі шкодніцкіх «партый» тыпу «прамысловай»—Рамзіных Ларычавых, «трудавой» Кандрацьева-Чаянавых, Суханава-Громанаў і інш. У БССР падрыўную работу праводзілі [illegible]ныя нацыянал-дэмакраты тыпу Ластоўскіх, Некрашэвічаў, Смолічаў і кампаніі. Аднак, наперакор шкодніцкім бандам, пралетарыят і працоўныя масы СССР, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, пасьпяхова перамагаюць цяжкасьці росту і будуюць сацыялізм.

Пралетарыят і працоўныя масы цьвёрда ўпэўнены, што пад выпрабаваным кіраўніцтвам ленінскай партыі і яе ЦК мы даб'ёмся і вырашым усе пастаўленыя перад намі задачы. Яшчэ з большай напружанасьцю сіл і энэргіі, выпрабаванымі мэтамі сацыялістычнай працы — ударніцтвам, сацспаборніцтвам, адмятаючы ў бок ніцкіраў і малавераў, правых апартуністаў, ашуючы з імі рашучую і непамірную барацьбу, як з галоўнай небясьпекаю на даным этапе, не паслабляючы барацьбы з «левымі» апартуністамі і беспрынцыпным права-«лявацкім» блёкам,—мы цьвёрда і ўпэўнена будуем і набудуем сацыялізм.

1931 год супадае з XII гадавінай абвяшчэньня самастойнасьці БССР. За гэтыя гады БССР пад кіраўніцтвам Ленінскай партыі, пры братэрскай дапамозе працоўных усяго Саюзу дасягнула вялізарнейшых посьпехаў і ператвараецца з краіны адсталай—аграрнай у краіну разьвітай індустрыі і сацыяльнай калектывізацыі.

1931 год—гэта год яшчэ больш разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце, гэта год новых рашаючых перамог на шляху сацыялістычнага будаўніцтва. У 1930 г. мы ў асноўным вырашылі зернавую праблему, 1931 год будзе годам вырашэньня мясной праблемы, праблемы жывёлагадоўлі. У гэты год мы яшчэ больш разаўём нашу індустрыю і машынатрактарнае будаўніцтва і тым узмоцнім абароназдольнасьць нашай краіны.

Бязьлітасна прыдушаючы клясавых ворагаў унутры краіны, выкідаючы з сваіх радоў апартуністаў, партыя на чале з ленінскім ЦК, на чале з сваім выпрабаваным кіраўніком павядзе рабочую клясу, калгасьнікаў і ўсё працоўнае сялянства бесстрашна ўперад па адзіна правільным шляху—шляху сьмелага разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Уперад, да новых перамог на сацыялістычным фронце!

Уступаем у трэці і рашаючы

Мы ўступаем у трэці рашаючы год пяцігодкі.

Ня гледзячы на шкодніцтва, якое мы мелі ў прамысловасьці СССР, і ў тым ліку ў БССР, [illegible] на выступленьні правых [illegible]ластаў, «левых» фразёраў і права-«лявацкага» блёку Сырцова-Ламінадзе супроць тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, супроць рашучага наступленьня на капіталістычныя элемэнты на ўсім фронце, ня гледзячы на ўсялякія прароцтвы клясавых ворагаў аб утапічнасьці пяцігодкі, рабочая клясa Савецкага Саюзу, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, дасягнула вялікіх посьпехаў ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі і значна перавысіла за першыя два гады намячэньні пяцігодкі як у прамысловасьці, так і сельскай гаспадарцы.

Вялікі энтузіязм рабочых мас давёў, што ўзятыя партыяй тэмпы рэальны. Лёзунгам кожнага рабочага на сёньняшні дзень зьяўляецца—«Пяцігодка—за чатыры гады».

Прынятыя апошнім пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б) кантрольныя лічбы народнае гаспадаркі ілюструюць небачаныя ў гісторыі дасягненьні рабочае клясы і намячаюць яшчэ больш эканамічны і культурны рост савецкага Саюзу.

Рост валавой прадукцыі ў 1929-30 годзе параўнальна з 1928-29 г. дае 67½ проц. Рост валавой прадукцыі за 1928-1929 год у адносінах да 1927-28 г. склае 48,1%, а за два гады, параўнальна з прамфінпляном пяцігодкі, 35,4 проц. З гэтых лічбаў відаць, які вялізарны рост мы маем у прамысловасьці БССР. Ні ў адной капіталістычнай краіне няма такога шпаркага росту, як у нас у БССР.

У мінулым 1928-29 годзе ў капітальнае будаўніцтва было ўкладзена 24 млн. рублёў, у гэтым 1929-30 г. мы ўклалі, паводле папярэдніх даных, 43,44 млн. рублёў, г. зн. амаль у два разы больш, чым у мінулым годзе.

Паводле пяцігодкі намечана давесьці колькасьць рабочых да 39,8 тыс., маемка ў 1929-30 г. 45 тысяч (толькі па прамысловасьці ВСНГБ). Рост колькасьці жанчын у нашай прамысловасьці такі, што, калі ў 1928-29 г. процант жанчын складаў 35,6, дык у 1930-31 г. —39,8 проц.

Прадукцыйнасьць працы ў гэтым годзе, параўнальна з мінулым годам, павялічылася на 25,3 проц., у той час, калі рост у мінулым годзе даў 23 проц.

Такі рост у параўнаньні з мінулым годам тлумачыцца тым, што мы падвялі электрычную базу пад нашу прамысловасьць. Павялічэньне прадукцыйнасьці працы ідзе не за рахунак мускульнай сілы рабочае клясы, як гэта робіцца ў капіталістычных краінах, а за рахунак павялічэньня энэргетычнай базы, за рахунак сьвядомага працоўнага энтузіязму, сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Мы маем, прыблізна, рост электраўзброенасьці нашага рабочага параўнальна з мінулым годам, на 40 проц., а па цэлай прамысловасьці энэргаўзброенасьць ласягае нават 55 проц.

Намінальная заработная плата за гэтыя два гады павялічылася на 11,12 проц. Узрос дабрабыт рабочае клясы, павялічыліся асигнаваньні на соц. страхаваньне і паляпшэньне сацыяльна-бытавых умоў рабочых (дамы адпачынку, курорты, ясьлі, сталоўкі і інш.).

За гэтыя 2 гады мы перавялі на 7-гадзінны рабочы дзень 52,3 проц. рабочых, занятых у рэспубліканскай прамысловасьці, на бесьперапынны тыдзень мы перавялі 79,4 проц. рабочых. У сувязі з гэтымі мерапрыемствамі, у нашу вытворчасьць уцягнута значная колькасьць рабочай сілы, што поўнасьцю ліквідавала беспрацоўе.

Зразумела, рост прамысловасьці Савецкай Беларусі дасягнут толькі дзякуючы правільнай, ленінскай лініі камуністычнай партыі пад кіраўніцтвам яе ЦК—у рашучай барацьбе супроць усякіх ухілаў ад генэральнай лініі партыі, таму, што мы знаходзімся ў Савецкім Саюзе і толькі пры палітычным і матар'яльным падтрыманьні Савецкага Саюзу, мы маем такі процант росту нашае прамысловасьці.

І калі нацыянал-дэмакраты прапаведвалі, вялі работу на адрыў Беларусі ад Савецкага Саюзу, на «самастойнасьць», а на справе на саюз з Польшчай, на падпарадкаваньне Польшчы, г. зн. зрабіць з Савецкай Беларусі буржуазную рэспубліку, дык гэта азначала ня толькі падняволеньне рабочае клясы палітычна, але і гаспадарчае заміраньне Савецкай Беларусі.

Таму мы з усёй рашучасьцю б'ём усіх тых, хто імкнецца адарваць Савецкую Беларусь ад Савецкага Саюзу. Мы толькі таму і маем вялізарнейшыя дасягненьні, што ўваходзім у Савецкі Саюз.

Параўнальна з 1928-29 годам валавая прадукцыя павялічылася на 67,5 проц. Гадавы плян мы выканалі на 95,3 проц., мы далі краіне валавой прадукцыі на суму 287.600 тыс. руб. Не дадалі прадукцыі на 13 мільёнаў рублёў.

На ўдарны квартал мы намецілі далейшы рост прамысловасьці па ўсіх галінах. Зьніжэньне сабекошту—на 7,2 проц. супроць сярэдняга гадавога ўзроўню 1929-30 г. (без Лесбелу). Рост валавой прадукцыі—на 85 проц. супроць першага кварталу і на 23,1 проц. супроць чацьвёртага. Рост прадукцыйнасьці працы—на 20 проц. супроць 14,6 проц. мінулага году. Рост рабсілы—на 54,1 проц. супроць першага кварталу, 7,3 проц. супроць чацьвёртага. Капітальнае будаўніцтва—17,2 млн. (без ільнапяньконага аб'яднаньня і Лесбелу, а з Лесбелам 24.670 тыс. руб.).

Але папярэднія вынікі гавораць аб тым, што ўдарны квартал ня дасьць нам тых паказальнікаў, якія мы запраектавалі, мы мяркуем выканаць прамфінплян ударнага кварталу на 91 проц.

Перавыкананьне прамфінпляну па асобных галінах нашае прамысловасьці тлумачыцца не аб'ектыўнымі прычынамі, а перш за ўсё невыстарчальнымі тэмпамі як у рабоце нашых апаратаў, так і саміх прадпрыемстваў.

Мы пачалі ўдарны квартал, слаба замацаваўшы тыя вынікі, якія мы мелі ў перасьні часьля адозвы ЦК УсеКП(б). Пільн ударнага кварталу бязумоўна, быў рэальны.

Калі мы возьмем пасобныя галіны нашай прамысловасьці, якія не залежаць ад завознага сырцу—запалкавую, папяровую—і гэтыя галіны прамысловасьці ня выканалі запраектаваных намячэньняў, у той час як суцэрчныя прамфінпляны газораць аб наяўнасьці ўсіх умоў і магчымасьцяй для выкананьня прамфінпляну.

На шляху выкананьня прамфінпляну мы мелі рад перашкод. Аднэй з перашкод зьяўляецца невыстарчальнае забесьпячэньне прадпрыемстваў сырцом і палівам, што выклікала ў некаторых выпадках прастоі, але-ж некаторыя прабуюць гэтым момантам прыкрыць сваю дрэнную працу.

Мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў, ня гледзячы на некаторы зрух, яшчэ не разгорнута. Таму нашай задачай зьяўляецца мабілізацыя ўсёй грамадзянскасьці на скарыстаньне ўсіх адкідаў вытворчасьці, хуткае прасоўваньне гатовай прадукцыі спажыўцу, барацьба з празьмернымі запасамі.

Пастаноўка плянаваньня паміж цэхамі, у саміх цэхах знаходзіцца яшчэ не на належнай вышыні. Слаба ідзе работа на пераводзе цэхаў на гаспадарчы разрахунак. Вопыт-жа паказаў, што ў цэхах, якія пераведзены на гаспадарчы разрахунак, плян расьце і пашыраецца. Таму ўжо ў пачатку 1931 г. трэба наладзіць плянаваньне паміж цэхамі і ў саміх цэхах і апошнія павінны быць пераведзены на гаспадарчы разрахунак. І чым хутчэй, тым больш мы выйграем ад гэтага. Кожны цэх будзе зацікаўлен у тым, каб сваю праграму выканаць, бо ад гэтага залежыць яго пашырэньне, спазчасовая выплата зарплаты рабочым і г. д.

Адносна адзінаначальля. Дабіцца сапраўднага адзінаначальля, каб дырэктар сапраўды адказваў за даручаную яму работу,—гэта абавязак і партячэйкі, і прафарганізацыі, і гаспадарніка.

У параўнаньні з мінулым годам, мы маем значна большае скарыстаньне прапаноў рабочых. Але гэтага яшчэ мала. На гэту справу трэба зьвярнуць больш увагі. Рабочая грамадзянскасьць праз друк павінна сыгналізаваць аб усіх выпадках замёку рабочай ініцыятывы, а гаспадарнік павінен дапамагчы друку ў гэтай рабоце.

Мы маем павялічэньне колькасьці нашае прадукцыі, але мы часамі забываем аб якасьці.

Мы павінны дабівацца павялічэньня колькасьці і патрабаваць якасьці.

Ад якасьці прадукцыі залежыць посьпех нашага сацыялістычнага будаўніцтва, а таксама рост рэальнай зарплаты рабочых і на гэты бок нам трэба зьвярнуць больш увагі.

Асноўнай задачай на 1931 год зьяўляецца суровая фінансавая дысцыпліна ва ўсёй народнай гаспадарцы, асабліва ў прамысловасьці.

Фінплян ударнага кварталу, у сувязі з незыкананьнем якасных паказальнікаў і перавыдаткаваньнем асигнаваньняў на капітальнае будаўніцтва, знаходзіцца ў напружаным становішчы—гэта ціпер адчувае амаль кожнае прадпрыемства. Мы маем пастанову партыі і ўраду скласьці бюджэт 1931 году без эмісіі і пастаўць фінансаваньне прадпрыемстваў, наогул, усёй народнай гаспадаркі, у залежнасьці ад выкананьня якасных і колькасных паказальнікаў прамфінпляну.

Адным з асноўных фактараў выкананьня прамфінпляну зьяўляецца рабсіла. Рабочая клясa сама зразумела шкоднасьць лятуніства і цэлымі заводамі абвяшчае сябе зжантраставанай да канца пяцігодкі. Урад таксама прыняў рад пастаноў аб барацьбе з цякучасьцю. Выкананьне гэтых пастаноў і далейшая мабілізацыя ўсіх рабочых на барацьбу з цяжкасьцю зьяўляецца аднэй з асноўных задач на 1931 год.

Адначасова павінны быць ужыты ўсе меры да разгортваньня шырокай сеткі навучальных устаноў і розных курсаў па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кадраў рабочай кваліфікаванай сілы і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу.

І на 1931 год аднэй з асноўных задач, якая забясьпечыць выкананьне прамфінпляну, зьяўляецца арганізацыя лепшай аховы працы на прадпрыемствах (поўнае скарыстаньне ўсіх асыгнаваных сродкаў, паляпшэньне сацыяльна-бытавых умоў рабочых). Таксама арганізацыя прадпрыемства забесьпячэньня, прамадзкага харчаваньня, забесьпячэньне спэцодзеткай, — гэта абавязак і каапэрацыі, і адміністрацыйнага пэрсаналу. Трэба пашырыць у раёнах асыгнаваньні на ясьлі, сталоўкі, клюбы і жыльлёвае будаўніцтва.

На 1931 год мы намячаем рост валавой прадукцыі ў параўнаньні з намячэньнямі пяцігадовага пляну, на 111 проц.: 448.700 тыс. руб. замест 212.200 тыс. руб. Зьніжэньне сабекошту намечана ў 6,4 проц., рост прадукцыйнасьці працы на 25 проц. і рост зарплаты да 7 проц. Праўда, гэтыя лічбы канчаткова яшчэ не зацьверджаны органам. Гэта толькі меркаваньні ВСНГБ.

Плян трэцяга рашаючага году пяцігодкі патрабуе ад усіх партыйных арганізацый, гаспадарнікаў, прафсаюзаў, усяе рабочае клясы БССР зьвінчэньня ўсіх паказаных недахопаў.

Рашучая барацьба з правымі і «левымі» апартуністамі, ажыцьцяўленьне ленінскай лініі партыі, пастаноўка выразнай і плянавай работы апарату, пераняцьцьне сюды мэтадаў сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, строгая дысцыпліна і адказнасьць за даручаную работу; максымум увагі да пастаноўкі, праверкі выкананьня плянаў і дырэктыў; рашучая барацьба з апартуністычнай практыкай, бюрократызмам, коснасьцю і непаваротлівасьцю, якія мы назіраем у пасобных частках нашага апарату; узмацненьне адзінаначальля, наладжваньне работы «трыкутніка» прадпрыемства: мабілізацыя творчага энтузіязму рабочых мас, разгортваньне і ўкараненьне новых мэтадаў сацыялістычнай працы (сацспаборніцтва і ўдарніцтва) — вось асноўныя задачы на 1931 год.

Мы ўпэўнены, што вызначаны плян будзе выкаран. Зарукай гэтаму — уздым актыўнасьці рабочае клясы, якая пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і яе ленінскага ЦК, ідзе па шляху далейшага наступленьня па ўсім фронце на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі, па шляху пераможнага будаўніцтва сацыялізму.

Г. Грысевіч.

Перад тварам рашаючага году

(Гутарка з сакратаром ЦК КП(б)Б тав. ГЕЕМ)

1931 год зьяўляецца трэцім годам пяцігодкі. Па радзе асноўных паказальнікаў мы павінны ўжо на працягу гэтага трэцяга году выканаць, а часткова перавыканаць канчатковыя заданьні пяцігадовага пляну. Аб'ём прамысловай прадукцыі БССР быў прадугледжан паводле пяцігодкі для апошняга году ня ў 534 мільёны рублёў. Аднак прамысловасьць БССР ужо ў трэцім годзе пяцігодкі перавышае гэта заданьне.

Паводле пяцігадовага пляну вызначалася калектывізаваць да канца пяцігодкі 13 проц. сялянскіх гаспадарак БССР,—гэта заданьне ўжо перавыкана: у новы гаспадарчы год мы ўступаем з колькасьцю калектывізаваных гаспадарак каля 15 проц.

Выкананьне і перавыкананьне пяцігадовага пляну, якое праводзіцца з вялікім посьпехам, ня толькі ня зьнімае напружанасьці тэмпаў і напружанасьці работы ў будучым гаспадарчым годзе, але наадварот патрабуе яшчэ большай выразнасьці, адказнасьці ў рабоце, яшчэ больш шпаркасьці тэмпаў выкананьня. Важнейшыя гаспадарчыя заданьні на надыходзячы 1931 год патрабуюць, як і раней, поўнай мабілізацыі сіл партыйнай арганізацыі. Прамысловасьць БССР у 1931 г. павінна больш чым падвоіць сваю прадукцыю ў параўнаньні з 1929-30 г. Побач з выкананьнем і перавыкананьнем прамфінпляну па ўсіх колькасных паказальніках, партарганізацыі на прадпрыемствах павінны забясьпечыць пералом ў справе паляпшэньня якасьці прадукцыі.

У галіне сельскай гаспадаркі нам прадстаіць зрабіць рашучыя крокі для вырашэньня жывёлагадоўчай праблемы і праблемы тэхнічных культур. У шырокіх разьмерах павінна разгарнуцца будаўніцтва жывёлагадоўчых саўгасаў, пабудова і абсталяваньне сьвінарнікаў, арганізацыя малочных фэрм, арганізацыя прыгарадных агародных гаспадарак спажывецкае каапэрацыі.

Узьнікшыя ў мінулым годзе калгасы вытрымалі першы экзамен першага гаспадарчага году. У надыходзячым гаспадарчым годзе да калгасаў будуць прад'яўлены яшчэ больш высокія патрабаваньні. Трэба рашуча пакончыць з рэшткамі ўтрыманскай псыхалёгіі ў калгасах, дабіцца рашучага пералому ў справе правільнай арганізацыі працы і разгарнуць будаўніцтва калгасаў больш шпаркімі тэмпамі, чым гэта мела месца да апошняга часу. Асноўным мэтадам вырашэньня гэтае задачы ў калгасах зьяўляецца пасьлядоўнае правядзеньне прынцыпаў прапоўнага дня.

Ні адно з заданьняў, якія стаяць перад партыяй, ня можа і ня будзе выконвацца ў парадку самацёку. Толькі апартуністы могуць прадстаўляць сабе справу такім чынам, што будаўніцтва сацыялізму праходзіць гладка. Шалёнае супраціўленьне кулацтва і рэшткі іншых эксплёататарскіх клясаў працягваецца, шкодніцтва, якое выкрыта на пэлым радзе вучасткаў, яшчэ ня выкарчавана да канца. Усё гэта патрабуе ад партыйнай арганізацыі клясавай пільнасьці і рашучага адпору ўсім варожым кулацкім капіталістычным элемэнтам і іх агэнтуры ў радох партыі—правым і «левым» апартуністам.

Посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва, з якімі партыя ўваходзіць ў трэці год пяцігодкі, абумоўлены пасьлядоўным ажыцьцяўленьнем генэральнае лініі партыі. Партыя адстаяла гэту лінію ў барацьбе супроць правых апартуністаў, супроць «левых» заскокаў, супроць беспрынцыпнага права-«лявацкага» блёку. У выніку—небывалае яшчэ да гэтага часу згуртаваньне партыйных радоў вакол ленінскага ЦК УсеКП(б), кіруючага справай будаўніцтва сацыялізму. Але перажыткі апартуністычных хістаньняў і ўхілаў усё яшчэ маюць месца ў арганізацыі. Правядзеньне раду адказьнейшых гаспадарчых кампаній, у асабліваści кампаніі па мабілізацыі грашовых сродкаў і па загатоўках хлеба, мяса, ільну і іншых прадуктаў сельскай гаспадаркі, выкрывае далёка не адзінкавыя выпадкі правага апартунізму на практыцы.

Рашучая бязьлітасная барацьба супроць усіх апартуністычных вылазак, супроць усіх скажэньняў генэральнае лініі партыі, у асабліваści, барацьба супроць пасьўнасьці, апартуністычнай стаўкі на самацёк, бюрократызму, чыноўніцтва і фармальна-абыякавых адносін да справы—зьяўляецца неабходнай прадпасылкай для таго, каб шырока разгарнуць калгаснае будаўніцтва, узмацніць ролю саветаў у справе ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі і з посьпехам выканаць заданьні трэцяга году пяцігодкі.

Праверка выкананьня ўсіх дырэктыў і пастаноў партыі—вось на што трэба накіраваць у надыходзячым годзе і, карыстаючыся гэтай зброяй, выявіць і вылавіць усіх шкоднікаў і апартуністаў, якія імкнуцца перашкодзіць сацыялістычнаму будаўніцтву.

Забясьпечыць вясеньнюю пасеўную насеньнем

Сакратарам РК КП(б)Б, старшыням РВК і асобаўпаўнаважаным СНК

Ход загатовак насеньня траў, кармавых кораніплодаў і гародніны знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Райкаапсаюзы, спажыўтаварыствы спадзяюцца на самацёк. З боку райкомаў, РВК адсутнічае праверка.

У сувязі з выключным значэньнем пытаньня загатовак насеньня траў, кармавых кораніплодаў і гародніны, для ўмацаваньня кармавой базы і разьвіцьця гародніцтва, прапануем пад адказнасьць сакратароў РК КП(б)Б, старшынь РВК, асобаўпаўнаважаных ЦК і СНК прыняць рашучыя захады, забясьпечваючыя выкананьне плянавых заданьняў у вызначаны тэрмін.

Пацягнеце да практычнай працы калгасьнікаў, бядняцка-серадняцкія масы, ліквідуйце бязьдзейнасьць загатоўчых арганізацый.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГЕЙ
Нам. Старшыні СНК БЭНЭК

Прывесьці ў гатоўнасьць інвэнтар

Поўнасьцю і своячасова забясьпечыць другую бальшавіцкую сяўбу сельгасмашынамі і інвэнтаром

Прызыдыум ЦК мэталістаў прыняў зварот да ўсіх ударнікаў рабочых, ІТР і служачых заводу сельска-гаспадарчага машына-будаўніцтва і заводаў забясьпечваючых іх сыравінай, мэталом і паўфабрыкатамі, аб забесьпячэньні другой бальшавіцкай сяўбы сельгасмашынамі і інвэнтаром.

«На сацыялістычных палёх другой бальшавіцкай сяўбы,—гаворыцца ў звароце,—па пастанове сьнежаньскага пленуму ЦК УсеКП(б) павінна быць засеяна больш 43 мільёнаў га. Выкананьне гэтага ўдарна-баявога заданьня залежыць ад таго, у якой меры заводы, выробляючыя машыны і інвэнтар для сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, выконваюць тэрміны, усталяваныя на іх партыяй і ўрадам абавязацельствы. Перамагчы ўсе цяжкасьці, дамагчыся высокай якасьці прадукцыі, своячасова і добраякасна адрамантаваць трактарны парк і выканаць праграму веснавой пасеўнай кампаніі, гэткія задачы кожнага мэталіста, які ўдзельнічае ў падрыхтоўцы бальшавіцкай сяўбы.

Да „Тыдня Савецкай Беларусі"

У сувязі з правядзеньнем «Тыдня Савецкай Беларусі» 3-га студзеня 1931 году ў Маскве ў Каманадэміі сэкратар ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіч зробіць даклад на тэму «Дасягненьні БССР».

Напярэдадні забастоўкі

Рэвалюцыйны пралетарыят Лянкашыру адкінуў прапаковы прамысловцаў і прафбюракратаў

ЛЕНДАН, 30-XII. У Лянкашыры адбыліся масавыя хітынгі лянкаширскіх ткачоў. На мітынгах абгаворваліся прапановы прадпрыемцаў аб увядзеньні з 5 студзеня сыстэмы, при якой павялічваецца ліч варштатаў, абслугоўваных адным рабочым.

Рабочыя рэзка выказваліся супроць прапаноў прадпрыемцаў. Рашучы настрой ткачоў яўна занепакоіў прафбюракратаў, якія склікалі на сёньня мітынг нібы для абгаварэньня мажлівасьці забастоўкі.

Мясцовая арганізацыя прафсаюзу ткачоў ў Дарвіне рашыла незалежна ад прафбюракратаў з пацыянальнага аб'яднаньня ткачоў, заклікаць рабочых да забастоўкі ў выпадку, калі новая сыстэма будзе праведзена ў жыцьцё.

У выніку энэргічнай кампаніі, разгорнутай рэвалюцыйным рухам меншасьці, у Дарвіне, у Блэкбэрне і іншых створаны «камітэты дзеяньня». 4 студзеня рух меншасьці зьбірае шырокую канфэрэнцыю ў Дарвіне для канчатковай падрыхтоўкі да барацьбы з прадпрыемцамі з самастойным рэвалюцыйным кіраўніцтвам.

Пілсудзкі зьлітаваўся над раваімі служкамі

ВАРШАВА, 30-XII. Гэтымі днямі з Брэсцкай турмы вызвалены арыштаваныя перад выбарамі ў сойм дэпутаты—пэпэсэавец Дыбуа, вызваленец Багінскі і дэпутат УНДО Кагут.

Абвастрэньне польска-нямецкіх адносін

ВАРШАВА, 30-XII. Заўтра кончыцца тэрмін нямецка-польскай згоды аб прывозе польскіх лясных матар'ялаў у Нямеччыну.

Польскія газэты заяўляюць, што новая згода ня будзе заключана на віне Нямеччыны. Разрыў згоды азначае адчуваньне мытнай вайны паміж Нямеччынай і Польшчай.

Вэн'эзлос у Варшаве

ВАРШАВА, 30-XII. Сёньня сюды прыбыў грэцкі прэм'ер Вэніэзлос.

«Газэта Польска» піша, што мэтаю прыезду Вэніэзлоса зьяўляюцца перамовы аб гандлёвым дагаворы з Польшчаю. Другія газэты паведамляюць, што грэка-польскія перамовы будуць кранацца, галоўным чынам, пытаньня аб дастаўках вялікіх партый грэцкага тытуню для польскай тытунёвай манаполіі.

Праграма другой бальшавіцкай вясны—важнейшая частка агульнай праграмы трэцяга году пяцігодкі

Сёньня 12-годзьдзе заснаваньня БССР

Камуністычная партыя і рабочая кляса падыходзяць да 13-га году існаваньня БССР, да 3-га году пяцігодкі з вялізарнейшымі дасягненьнямі

Пры брацкай дапамозе Савецкага Саюзу, у барацьбе супроць апартунізмаў усіх колераў і прымірэнцтва да іх, супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць беларускага контррэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму і шавінізмаў іншых колераў магчымы былі гэтыя дасягненьні, магчыма далейшае ператварэньне БССР у краіну разьвітай індустрыі і суцэльнай калектывізацыі

А. Чарвякоў

Задачы саветаў і дзяржапарату ў 3-м годзе пяцігодкі

Галоўнай задачай саветаў зьяўляецца няўхільнае і цьвёрдае правядзеньне ў жыцьцё генэральнай лініі партыі. З гэтае прычыны тая справаздачна-перавыбарчая кампанія саветаў, што адбываецца ў сучасны моант, ставіць, як асноўную задачу, перабудову ўсёй працы саветаў у адпаведнасьці з задачамі рэконструкцыйнага пэрыяду на аснове ўзьняцьця ролі саветаў, як праваднікоў генэральнай лініі партыі, як рашучых барацьбітоў супроць варожых лініі партыі правага і «левага» апартунізмаў.

Важнейшыя задачы стаяць перад саветамі ў наступаючым годзе.

Каб выканаць сваю ролю, саветы павінны ва ўсёй сваёй рабоце апіравацца на масавы актыў і перш за ўсё на ўдарнікаў фабрык і заводаў і на калгасьнікаў і беднату ў вёсцы. Выкарыстаньне новых сацыялістычных форм працы ў якасьці ўдарніцтва, сацспаборніцтва і г. д., шырокае разгортваньне пралетарскай крытыкі і самакрытыкі павінна быць штодзенным мэтадам масавай работы саветаў. Разгортваючы працу сярод ударнікаў, сярод калгасьнікаў і беднаты, саветы, пад кіраўніцтвам кампартыі, будуць ушчываць новыя мільёны рабочых і сялян у актыўную працу сацыялістычнага будаўніцтва.

Асобная ўвага павінна быць зьвернута на ўпягненьне ў практычную работу саветаў жанчын-работніц, калгасьніц батрачак, бяднячак і лепшых сераднячак.

Важнейшай справай у працы саветаў зьяўляецца пераход на раённую сыстэму кіраўніцтва. з перанясеньнем «цэнтру пяжкасьці працы партыі і савецкае ўлады ў раёны.

Вось чаму рашучае правядзеньне гэтага мерапрыемства ў адпаведнасьці з пакаваньнямі партыі і ўлады зьяўляецца вяўлікіньм абавязкам як цэнтральных, так і мясцовых органаў улады.

Уся праца саветаў павінна быць накіравана на тое, каб мабілізаваць масы на выкананьне задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Барацьба за выкананьне прамфінпляну. арганізацыя і кіраўніцтва калгасным рухам бядняцка-серадняцкіх мас вёскі і ліквідацыя кулацтва як кляс на базе суцэльнай калектывізацыі, разгортваньне мерапрыемстваў культурнага будаўніцтва і, у першую чаргу, па ўсеагульным навучаньні, ліквідацыі няпісьменнасьці і падрыхтоўцы пралетарскіх кадраў, паляпшэньне матар'яльнага і культурнага дабрабыту рабочае клясы і ўсіх працоўных, цьвёрдае выкананьне ўсіх чарговых гаспадарча-палітычных задач,—вось тыя практычныя задачы, якія стаяць перад саветамі.

Важнейшай задачай у працы саветаў павінна зьяўляцца ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Вядучы нясупынную і бязьлітасную барацьбу супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі, супроць контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму і шавінізмаў іншых колераў,—саветы праз актыўнае правядзеньне ў жыцьцё мерапрыемстваў партыі і ўраду па нацыянальнай палітыцы будуць зьнішчаць рэшткі нацыянальнай абмежаванасьці, варожасьці, замкнутасьці і замацоўваць інтэрнацыянальнае аб'яднаньне працоўных усіх нацыяльнасьцяй для барацьбы за сацыялізм.

Абвастрэньне клясавай барацьбы ўнутры краіны Саветаў, пагрозы інтэрвэнцыі супроць краоны Саветаў з боку сусьветнай буржуазіі патрабуюць вялізарнай пільнасьці з боку саветаў. У адказ на контр-рэвалюцыйную дзейнасьць шкоднікаў Рамзіных, Лёсіжаў, Ластоўскіх, лёкаяў сусьветнага капіталу, у адказ на пагрозы інтэрвэнцыі, саветы павінны з яшчэ большай пасьпяховасьцю разгортваць сацыялістычнае будаўніцтва, рашуча выкарчоўваць карэньні капіталізму і павялічваць абароназдольнасьць краіны.

Для таго, каб саветы сапраўды забясьпечвалі правядзеньне ў жыцьцё генэральнай лініі партыі, трэба ўзмацніць барацьбу супроць ухілаў ад лініі партыі, супроць правага ўхілу, супроць «левых» загібаў, супроць права-«лявацкага» блёку і прымірэнчых да іх адносін. Асабліва небясьпечным зьяўляецца правы ўхіл і права-апартуністычная практыка ў працы саветаў. З гэтае прычыны ня можа быць месца правым апартуністам і бясспрынцыпным прымірэнцам у кіруючых органах саветаў. Бязьлітасная барацьба супроць права-апартуністычнай практыкі ўзьніме ролю саветаў у практычным правядзеньні генэральнай лініі партыі па ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва.

Шырока разгортваючы сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце, ачышчаючыся ад усіх апартуністычных і прымірэнчых элемэнтаў у складзе саветаў, вядучы рашучую і бязьлітасную барацьбу супроць контр-рэвалюцыйных, шкодніцкіх нацыянал-дэмакратычных элемэнтаў, як клясавых ворагаў пралетарыяту, саветы пад кіраўніцтвам кампартыі з гонарам будуць выконваць сваю важнейшую ролю органаў дыктатуры пралетарыяту, праводзячы ў жыцьцё рашуча і да канца генэральную лінію партыі.

Праца савецкага апарату цесна зьвязана з працай саветаў.

Савецкі апарат зьяўляецца выканаўцай дырэктыў партыі і ўраду. Гэта вымагае вялікай выразнасьці ў працы савецкага апарату. Аднак, за мінулы час мы маем рад прыкладаў таго, як клясава-варожыя пралетарскай рэвалюцыі элемэнты, якія прасачыліся ў савецкі апарат, імкнуліся выкарыстаць свае становішча для контр-рэвалюцыйнай шкодніцкай работы.

XVI зьезд УсеКП(б), кажучы аб недахопах савецкага апарату, даў наступнае ўказаньне: «Безадказнасьць, чыноўніцкае самаздавальненьне, адсутнасьць сумленнага і дакладнага выкананьня дырэктыў партыі і ўраду зьяўляецца найбольш небясьпечным і злосным відам бюракратызму. Бязьлітасная барацьба з гэтым нецярпімым злом, абавязковае давядзеньне да канца праверкі выкананьня павінна стаць генэральнай установкай у барацьбе з бюракратызмам». (Рэзалюцыя зьезду па справазд. ЦКК-РСІ).

Трэба на працягу 1931 году рашуча ачысьціць савецкі апарат ад усіх варожых, контр-рэвалюцыйных элемэнтаў, трэба ўдасканаліць працу апарату, выкрываць і зьнішчаць праявы бюракратызму, безадказнасьці і чыноўніцкага самаздавальненьня. У БССР адзэй з важнейшых задач павінна быць барацьба супроць праяў у апараце вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекай, супроць беларускага нацыянал-дэмакратызму, супроць шавінізму іншых колераў. Павінны быць ужыты рашучыя захады, каб поўнасьцю правесьці ў жыцьцё пастанову апошняга пленуму ЦК УсеКП(б): «Трэба падтрымаць і ўсямерна разьвіваць кантроль рабочых і сялян зьнізу над працай дзяржапарату, (напрыклад, групавыя абсьледваньні сав. органаў пад кіраўніцтвам РСІ, брыгады рабочых па азнаямленьні з работай установ) і новыя формы добраахвотнага ўдзелу рабочых у выкананьні дзяржаўнай працы (напр: па міліцыі)».

Новыя формы працы ў выглядзе сац спаборніцтва, ударніцтва для лепшай пастаноўкі працы апарату, зьніжэньня адміністрацыйных выдаткаў, наближэньня апарату да працоўных мас; разшучае разгортваньне вакол працы савецкага апарату пралетарскай крытыкі і самакрытыкі і арганізацыя пастаяннай праверкі выкананьня савецкім апаратам дырэктыў партыі і ўраду,—вось тыя практычныя задачы, вырашэньне якіх будзе садзейнічаць паляпшэньню савецкага апарату.

Трэба прасякнуць савецкі апарат моцнай пралетарскай праслойкай, забясьпечыць у апараце сталае пралетарскае кіраўніцтва і праз усё гэта дабіцца ад савецкага апарату «сумленнага і дакладнага выкананьня дырэктыў партыі і ўраду» ў справе сацыялістычнага будаўніцтва і выкананьня пяцігодкі за чатыры гады, у выкананьні задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Белдрэс імя Сталіна—буйнейшая перамога Савецкай Беларусі

НАТХНІЦЕЛІ БУДНЯЎ

За некалькі дзён да канца другога году пяцігодкі на заводзе настрой напружаны. У заўкоме, у ячэйцы, у дырэктара, у ТНБ гутарка вакол аднэй тэмы:

— Ліцейны і кавальскі, калі яны не падкачаюць, дык мы на коні... Але дзе гарантыя?

— Прасіць гарантыі—апартунізм.

— Ты кінь, кінь наконт апартунізму, лягчэй. Я гавару, што толькі 246 абцугоў гарантыя для кавальскага, а 3 з паловай тоны броньчастак штодня—гарантыя для ліцейнага.

— Трэба значыцца—націснуць.

— Націснуць, націснуць, але дзе твая канкрэтная прапанова.

Такія размовы матлі-б стварыць уражаньне, што на «Камунары» наогул справы цьмяныя, але гэта ня зусім так. Завод выканаў праграму другога году пяцігодкі па ўсіх паказьніках. Нават два месяцы асобнага кварталу выкананы з перавышэньнем. Толькі ў трэцім месяцы была затрымка ў ліцейным і кавальскім цэхах. Але гэтая затрымка будзе ліквідавана. У гэтым парукай абяцаньні ліцейшчыкаў і кавалёў.

Вось становішча на заводзе, вось фонд, на якім брыгада камнядрабілак, аб якой сёньня гутарка, ўсё-ж выпукляецца.

Зойдзем да іх у цэх.

Ля выхаду выстраілася чарга камнядрабілак. Спакойна глядзяць яны адна аднэй у плечы, важна выпіраюць жываты. На рукаве кожнай камнядрабілкі надпіс крэйдай «гатова». Камнядрабілкі сабраны, зьвярстаны, прыладжаны, застаецца толькі накінуць прывадныя рамні, уключыць матор і, грохкаючы, малаточкі варштату будуць драбіць да жарствы, у дробныя іскрыстыя кавалкі, вялікія камяныя глыбы.

Зборачны цэх прытуліўся ў вузкай дабудове да такарнага. Тут цесна. Зборачны — не адны камнядрабільшчыкі. Тут побач і зборачнікі помпаў, якія займаюць вялікую плошчу з гэтага вузкага квадрату. Цесна. Хадзіць па цэху значыцца сказаць, гуляць у скокі з перашкодамі.

А зараз і крыху гісторыі.

Спачатку іх было чатыры (2 гады таму назад), арганізатар брыгады камнябрабільшчыкаў - камсамолец Маркман.

Потым іх было 17, потым 25, а зараз 32. Апошняя лічба 32 не зьмянялася на працягу ўсяго ўдарнага кварталу.

На заводзе брыгаду камнядрабілак называюць брыгадай Кандратовіча. Гэта не таму, што Кандратовіч належыць нейкі вялікіны гонар і не таму, што Кандратовіч лепшы ўдарнік. Праўда, Кандратовіч стары рабочы мае за сваёй сьпіной 18 год работы на заводах па камнядрабілках, але брыгаду называюць «брыгадай Кандратовіча» таму, што Кандратовіч старэйшы брыгадзір і таму яшчэ, (здаецца гэта будзе верна), што «брыгада па зборцы камнядрабілак сьлясарна-зборачнага цэху» вымаўляецца больш цяжка.

Гэта па нашаму імённа так.

У брыгадзе 13 камсамольцаў, 3 партыйцы. У брыгадзе больш маладых, большасьць «цытоўцы», якія прайшлі школу навуковай арганізацыі працы, новыя рабочыя—маладняк. 4 старых рабочых сярод гэтай групы «бязвузных энтузіястаў», як кажуць, замаладзіліся.

Расьце партыйнае ядро ў брыгадзе. Двое рыхтуюцца ў партыю, трое ў камсамол.

У тыя дні, калі мы на заводзе выяўлялі лепшую брыгаду, дык пыталіся ў рабочых.

— Скажэце чаму вы лічыце брыгаду Кандратовіча лепшай і чым гэта вы тлумачыце?

Адказвалі па розваму. Але адзін адказ вярнейшы за ўсё. Нам сказалі:

— Яны адзін аднаму дапамагаюць. Гэта сапраўдная рабочая сям'я.

Рабочыя гаварылі тут аб сапраўднай камуністычнай працы. І гэта верна.

Успомнім з якім абурэньнем 31 брыгадзір асудзілі прагульшчыцу Запольскую, якая зрабіла 3 прагулы.

— Вон з брыгады. Нам прагульшчыц ня трэба.

— Не спраўляешся—дапаможам, перашкаджаеш—выганім.

Пасьля гэтага ня падкачаюць. Выбірайце таварышы памём чорнай дошкай і сапраўдным ударніцтвам.

Упяршыню аб брыгадзе камнядрабілак загаварылі ў леташняй пасеўнай кампаніі. Здарылася гэта так.

28 сакавіка брыгада павінна была здаць партыю камнядрабілак. Тады брыгада нарашыла.

— Здамо раней тэрміну і больш пляну.

Работа закіпела. За 10 дзён да тэрміну скончылі партыю і зрабілі на адну камнядрабілку больш.

Аб брыгадзе загаварылі. Брыгаду ўрачыста прэм'явалі. Далі падарунак.

А спачатку асобнага кварталу адміністрацыя высунула перад камнядрабільшчыкамі досыць моцны прамфінплян. За 3 месяцы брыгада павінна была даць 170 камнядрабілак. Брыгада выставіла сустрэчны ў 180. А пасьля першага месяцу работы брыгада Кандратовіча выставіла новы сустрэчны і давяла колькасьць камнядрабілак да 190.

У сустрэчных лічбах ня было вухарства ці жаданьня пафасоніць. Сустрэчны высоўваўся па месяцах, правяраўся на рабоце, улічваліся ўсе сілы брыгады і кожнага ўдарніка ў паасобку.

У кастрычніку брыгада дала звышпляну адну камнядрабілку, у лістападзе—2, у сьнежні—18. А ўвесь сустрэчны (новы сустрэчны 190 штук) быў выкананы 26 сьнежня а 18 гадзіне 30 хвілін.

Вынікі ўдарнага кварталу:

Замест 190 па пляну—211. Звыш пляну 21 камнядрабілка ці агуловай прадукцыі на 21.000 руб.

Чаму менавіта аб іх гаварылі сёньня. Чаму з усяго ўдарнага заводу мы выхвацілі гэтую брыгаду. А гэта таму, што на рабоце гэтай брыгады мы можам правільна знайсьці пульс заводу, таму што брыгада камнядрабілак мае адзін узрост з нашай пяцігодкай, таму што і яны як і ўся наша краіна з вялікімі посьпехамі ўступае ў трэці ўдарны год барацьбы за ленінскі плян пабудовы сацыялізму.

Б. Брадоцкі.

Вышэй тэмпы энэргабудаўніцтва

Энэргетычная база народнае гаспадаркі БССР на парозе 3-га году пяцігодкі

Рабочая кляса БССР пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, пры дапамозе Савецкага Саюзу пасьпяхова закончыла ўдарны квартал і ўступае ў 3-ці рашаючы год пяцігодкі. Праводзячы генэральную лінію партыі, рабочая кляса дамаглася вялікіх дасягненьняў і ў галіне электрафікацыі БССР.

На працягу пяцігодзьдзя энэргетыка павінна ператварыцца з «вузкага месца» ў кіруючы пачатак народнае гаспадаркі БССР. Рашаючы трэці год пяцігодкі павінен прайсьці пад знакам самага фарсаванага энэргабудаўніцтва, якое зьяўляецца важнейшай умовай разьвіцьця прамысловасьці і ўсяе народнае гаспадаркі цалкам. Па БССР на працягу 1931 году павінны ўступіць у эксплёатацыю рад энэргаўстановак сумарнай магутнасьцю ў 19.800 квт. у дапаўненьне да магутнасьці, якая ўступіла ў асобным квартале ў 26.600 квт.

Апроч таго, у 1931 годзе павінна быць пачата энэргабудаўніцтва ў такім абёме, каб у 1932 годзе ўвесьці ў эксплёатацыю цэлы рад новых энэргаўстановак.

Запраектаваны рост энэргаўзброенасьці БССР характарызуецца наступнай таблічкай:

	1-X—30 г.	1-I—31 г.	1-I—32 г.
Сумарная магутнасьць энэргагаспадаркі БССР (квт)	18.000	46.600	66.400
Выпрацоўка электраэнэргіі ў мільёнах (квт.) гадзін	66,4	82,5	183,6

Асаблівы інтарэс становіць ня столькі сам па сабе колькасны бок росту, колькі якасныя зрухі, што адбываюцца ў энэргетыцы БССР. Рэвалюцыя ў энэргетыцы не абмяжоўваецца заменай старых, маральна і матар'яльна зношаных, маламоцных рознастайных і неэканамічных энэргаўстановак раённымі магутнымі электрацэнтралямі, абсталяванымі па апошнім слове тэхнікі. (Станцыя імя Сталіна абсталявана турбагенэратарамі вышэйшай ступені эканамічнасьці). Справа ў тым, што побач з увядзеньнем навейшых дасягненьняў у энэргетыцы (высокі ціск і перагрэвы пару, высокія напружаньні, рэгенэратыўныя цыклі і г. д.) уводзяцца вышэйшыя найбольш удасканаленыя формы энэргетыкі: пабудова энэргаўстановак на базе мясцовага паліва (торф), максымальнае скарыстаньне адходных унутрыпрамысловых энэргетычных рэсурсаў (апілкі, аддубіна, кастра) і самая галоўная пабудова цёплаэлектрацэнтраляў з камбінаванай вытворчасьцю цёплавой і электрычнай энэргіі.

Шырокае будаўніцтва цёплаэлектрацэнтраляў, намечанае плянам, зьяўляецца асабліва паказальным таму, што на падставе дырэктыў СПА, у галіне цёплафікацыі і будаўніцтва цёплаэлектрацэнтраляў неабходна ў самы кароткі тэрмін дабіцца рашучых зрухаў. Пастанова СПА абавязвае, пры вырашэньні пытаньняў забясьпечаньня электрычнай энэргіяй ад цёплавых установак, выходзіць з неабходнасьці будаўніцтва ў першую чаргу цёплаэлектрацэнтраляў, аж-да такога разьвіцьця, пры якім толькі тая частка патрэбаў у электрычнай энэргіі, якая ня можа быць пакрыта цёплаэлектрацэнтралямі, пакрывалася-б выключна сілавымі электрычнымі станцыямі. Народна-гаспадарчы эфэкт цёплафікацыі надзвычайна значны. Досыць зазначыць на тое, што каэфіцыэнт карыснага дасяньня цёплаэлектрацэнтраляў у 2-3 разы вышэй ККД раённых электрастанцый.

Рэвалюцыю перажывае апалавая база энэргаўстановак. Тут справа не абмяжоўваецца пераходам з ларагога і дэфіцытнага далёкапрывознага мінералу (вугаль, нафта) на мясцовыя выгляды апалу (торф, адсіды). Нельга абійсьці маўчаньнем той факт, што новыя ўстаноўкі, як правіла, праектуюцца на фрэзэрным торфе, які здабываецца найбольш танным мэханізаваным спосабам з забясьпечаньнем мінімальных капітальных затрат і максымальнай вытворчасьці торфараспрацовак. Плянам прадугледжваецца гатовае разгортваньне ў шырокім маштабе вышукаў па будаўніцтве энэрга-хімічных прамысловых камбінатаў: энэрга-хэмічнага камбінату на базе электраэнэргіі (15.000 квт.), гідраэлектрацэнтралі Кабеляцкіх парогаў (на Дняпры ў Ворпы) і электра-хэмічнага сэлікатнага камбінату на базе энэргіі Пралойскай ГРЭС (120.000 квт.). Зусім зразумела, што вялізарнасьць праблемы паказаных камбінатаў патрабуе правядзеньня ў вялікім маштабе вышукаў і падрыхтоўчых работ.

Падагульваючы вынікі, неабходна адзначыць недастатковасьць увагі, што адасьцца энэргетыцы. Да гэтага часу не арганізаваны энэргасэктары ў Дзяржплане, Наркамземе, Наркамснабе і аб'яднаньнях ВСНГ БССР.

Ня вырашана яшчэ пытаньне аб арганізацыі адзінага энэргетычнага цэнтру, асабліва кіраўніцтва па энэргабудаўніцтве.

Зусім недастаткова разгортваюцца энэргадасьледчыя работы і падрыхтоўка тарфяных баз.

Пяцігодка электрабудаўніцтва ў БССР павінна быць яшчэ больш акружана ўвагай і любоўю.

З год пяцігодкі рашаючы і для пяцігодкі электрабудаўніцтва. Рабочая кляса, а разам з [illegible] перныя яе інтэлігэнцыя-тэхнічныя [illegible] нікам і ўсім ня[illegible] занадзвэнтам, даў[illegible] батракоў і ялістычных [illegible] і тэхнікушай электры[illegible] рэньня яе ў [illegible] краіну.

Ударнікі на перадавых пазіцыях

Прэміяваная ўдарная брыгада т. Арлова на будуючымся ў Крычаве цэмантовым заводзе.

Падарунак трэцяму году пяцігодкі

Рад прадпрыемстваў г. Бабруйску скончыў ўдарны квартал са значным перавышэньнем прамфінпляну.

На шчацінай фабрыцы прамфінплян на 1 студзеня выкананы на 107 проц. Бабруйская друкарня выканала свой сустрэчны 23-XII—да 1-I плян перавыкананы на 10 проц.

Мэблевая фабрыка выканала прамфінплян на 111 проц., прадукцыйнасьць працы павялічана на 17 проц.,сабекошт зьніжаны на 5 проц.

Фанэрны завод імя Томскага перавыканаў плян ударнага кварталу на 3 проц., лесапільны цэх камбінату—101 проц., гарбарня № 4—100 проц.

Машынабудаўнічы завод на 1-I выканаў праграму на 88 проц., рабочыя заводу абавязваюцца ў самыя бліжэйшыя дні вярнуць заводу яго гнаровае імя.

Адстаюць мармалядная, швэйнаяфабрыкі і астатнія цэхі камбінату.

А. Д.

Змагары за ўдарны

Першымі барацьбітамі за пяцігодку ў чатыры гады, за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну ўдарнага кварталу па Магілёве трэба лічыць ўдарнікаў мэблевай фабрыкі імя Халтурына і гарбарні імя Сталіна.

Рабочыя гэтых прадпрыемстваў зьяўляюцца сапраўднымі змагарамі за ажыцьцяўленьне лёзунгу партыі: «дагнаць і перагнаць».

Рабочыя і адміністрацыйны пэрсанал мэблевай фабрыкі датэрмінова (на 19 дзён) закончылі сваё баявое заданьне на вытырчым фронце. Фабрыка маючы сустрэчны прамфінплян на ўдарны квартал у 76.700 руб. на 12 сьнежня перавыканала яго на 11,5 проц. Якасьць прадукцыі значна палепшылася супроць 4 кварталу 1930 году, зьменшыўся брак на 70 проц. Праводзіцца шэраг рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў. Арганізуецца канвэер для падачы матар'ялу да машын. Гэта дае эканомію фабрыцы, растуць і шэрагі ўдарнікаў. Увесь калектыў фабрыкі замацоўвае сябе за прадпрыемствамі да канца пяцігодкі.

Другім змагаром у барацьбе за прамфінплян асобнага кварталу выступае гарбарня імя Сталіна, якая на 20 сьнежня выканала свой прамфінплян па 102,9 проц.

Рабочыя гэтых прадпрыемстваў, уваходзячы ў трэці год, залажылі сталы падмурак, для далейшага выкананьня пяцігодкі.

Такія дасягненьні і бадзёры настрой рабочых мас наносяць моцны ўдар па ныцікам, малаверам, па лягеру правых апартуністаў.

Волны.

М. Галадзед

31 вырашае выкананьне пяцігодкі за 4 годы

Мы ўваходзім у 1931 г.—3-ці і рашаючы год пяцігодкі—з вялізарнымі перамогамі на фронце разгорнутага сацыялістычнага наступленьня. Пасьпяховае выкананьне першых 2-х гадоў пяцігодкі са значным перавыкананьнем праектаваньняў пяцігодкі па важнейшых і рашаючых галінах народнай гаспадаркі абумовіла поўную магчымасьць запраектаваць народна-гаспадарчы плян на 1931 г. у значна павышаных разьмерах.

Прыняты аб'яднаным пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б) плян разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры Савецкага Саюзу на 1931 год зьяўляецца гіганцкай праграмай бальшавіцкіх работ па завяршэньні пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі. Асноўнае значэньне гэтага пляну заключаецца ў тым, што ў ім, як і ў папярэдніх пляцах, якія прымаліся нашай партыяй, асабліва ярка адбіваецца пасьлядоўнае правядзеньне генэральнай лініі ленінскай партыі, лініі, разьлічанай на максымальна напружаны тэмпы індустрыялізацыі і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі па шляху яе калектывізацыі.

Разам з адбітымі ў пляне ўстаноўкамі на падцягваньне лёгкай індустрыі, у ім канцэнтруецца асноўная ўвага на вузлавых індустрыяльных вучастках: мэталь, вугаль, машынабудаўніцтва, як на асноўных вагарох сацыялістычнай індустрыялізацыі і сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі.

Посьпехі індустрыялізацыі ў першыя 2 гады пяцігодкі, яе гіганцкі рост абумовілі карэнны пералом у бок сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі. Вызначаньне народна-гаспадарчага пляну ў 1931 г. будзе далейшым гіганцкім крокам у бок пабудовы сацыялістычнай эканомікі.

Характэрнай рысай пляну 1931 г. зьяўляецца і тое, што асноўная маса капітальных укладаньняў накіроўваецца на галоўнейшыя індустрыяльныя аб'екты з устаноўкай на скарачэньне тэрмінаў будаўніцтва і з мэтай хутчэйшага пуску ў дзейнасьць новых індустрыяльных гігантаў.

Гэта мае асабліва важнае значэньне таму, што гэтай установкай абумоўліваецца хутчэйшы зварот укладаемых капіталаў на індустрыялізацыю Савецкага Саюзу, што дасьць у выніку найбольшы эфэкт росту сацыялістычнай эканомікі і стварае асноўныя прадпасылкі да яшчэ большага паскарэньня тэмпаў сацыялістычнага росту.

Ажыцьцяўленьне народна-гаспадарчага пляну 1931 г. дасьць новы, нячуваны ў гісторыі чалавецтва, разьбег па будаўніцтве сацыялізму. Гэты плян і яго ажыцьцяўленьне—ёсьць новы гіганцкі скачок у сацыялістычнае грамадзтва.

Разам з узмацненьнем сродкаў і ўвагі ў бок забясьпячэньня шпаркага росту важнейшых галін індустрыі плянам вызначаюцца вялікія задачы па сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі. Устаноўка на завяршэньне ў асноўным калектывізацыі па галоўных збожжавых раёнах Савецкага Саюзу і на завяршэньне ў гэтых раёнах і ліквідацыі кулацтва, а таксама давядзеньне калектывізацыі ва ўсім Савецкім Саюзе да 50 проц. усіх сялянскіх гаспадарак—ёсьць фактар вялікага гістарычнага значэньня.

Пры ажыцьцяўленьні гэтай задачы наш Савецкі Саюз зьявіцца зусім непераможнай дзяржавай, у якой ня толькі будзе завершана пабудова фундаманту сацыялістычнай эканомікі, але будзе зроблен новы гіганцкі крок па арганізацыі сацыялістычнага грамадзтва.

Народна - гаспадарчы плян БССР, прыняты СНК і ўхвалены сэсіяй ЦВК БССР, зьяўляючыся часткай агульнага Саюзнага пляну, таксама вызначае павышаныя тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР, якія далёка перавышаюць праектаваньні пяцігодкі.

Вынікі гаспадарчага будаўніцтва БССР за першыя 2 гады пяцігодкі са значным перавыкананьнем праектаваньняў далі магчымасьць праектаваць кантрольныя лічбы разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры БССР на 1931 год у такіх разьмерах, якія поўнасьцю забясьпечылі-б выкананьне лёзунгу «Пяцігодка—за 4 гады».

Канкрэтныя задачы, якія перад намі стаяць, заключаюцца ў тым, што мы павінны працу арганізаваць так, каб поўнасьцю забясьпечыць выкананьне кантрольных лічбаў, вызначаных на 1931 год.

Асноўную ўвагу ва ўмовах БССР мы павінны канцэнтраваць на далейшым узмацненьні вядучай ролі прамысловасьці ў разьвіцьці народнай гаспадаркі БССР і паставіць у цэнтры ўвагі ўсіх савецкіх, партыйных, прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый задачу ажыцьцяўленьня сацыяльнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі і на гэтай падставе няўхільна праводзіць ліквідацыю кулацтва, як клясы. У галіне прамысловасьці мы павінны сканцэнтраваць увагу на выкананьні прамфінпляну 1931 году, асабліва яго якасных паказальнікаў: павялічэньне прадукцыйнасьці працы, зьніжэньне сабекошту прампрадукцыі, абавязковае паляпшэньне яе якасьці і інш.—гэтыя задачы павінны быць выкананы. Да гэтага трэба імкнуцца зараз у першыя месяцы. Ні адзін месяц не павінен мець ні на адзін процант недабору, наадварот, патрэбна перавыкананьне першых месяцаў 1931 году—толькі гэта гарантуе выкананьне гадавога пляну.

Усю работу па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі БССР па шляху яе калектывізацыі мы павінны праводзіць пад кутом погляду вырашэньня праблемы жывёлагадоўлі, як асноўнай праблемы ў сучасны пэрыяд, якая паўстала перад усёй нашай партыяй пасьля вырашэньня ў асноўным збожжавай праблемы.

Маючы на ўвазе, што напрамак разьвіцьця сельскай гаспадаркі БССР накіроўваецца па шляху разьвіцьця жывёлагадоўлі і тэхнічных культур, нашай асноўнай задачай зьяўляецца вырашэньне іменна гэтай праблемы—праблемы жывёлагадоўлі і разьвіцьця ільнаводзтва і канаплянодзтва. У працы па далейшай калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак неабходна выходзіць з абавязковай спэцыялізацыі як існуючых, так і новых калгасаў і саўгасаў і іменна ў вышэйпаказаным напрамку. Трэба пазнаць, што разьвіцьцё жывёлагадоўлі зьяўляецца адным з асноўных элемэнтаў паляпшэньня харчовага забясьпячэньня рабочае клясы і ўсіх працоўных мас.

БССР павінна ператварыцца ў рэспубліку ўзрастаючай сацыялістычнай прамысловасьці жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў, саўгасаў і калгасаў тэхнічных і працаёмкіх культур. Гэта задача абавязкова для ўсёй партыйнай і савецкай грамадзкасьці. Мы павінны ўжо ў 1931 г. зрабіць БССР рэспублікай буйных сацыялістычных фабрык, жывёлагадоўлі і тэхнічных культур.

Зусім зразумела, што дадатныя вынікі выкананьня першых двух год пяцігодкі і павышаныя праектаваньні на 1931 г. зьявіліся вынікам цьвёрдага правядзеньня генэральнай лініі партыі, рашучага пераматаньня супраціўленьня клясавага ворага: кулака, нэпмана, шкодніка і нацыянал-дэмакрата і вынікам поўнага банкрутства і разгрому правых апартуністаў і ўсякіх права-«лявацкіх» бяспрынцыпных блёкаў.

Пасьпяховае ажыцьцяўленьне народна-гаспадарчага пляну 1931 году патрабуе ад усіх рабочых, калгасьнікаў і ад усіх партыйных і савецкіх арганізацый далейшага няўхільнага правядзеньня ленінскай палітыкі нашай партыі і сыстэматычнай барацьбы з усімі апартуністычнымі і нацыянал-апартуністычнымі праяўленьнямі з боку няўстойлівых, хісткіх элемэнтаў. Трэба і надалей адмятаць у бок нацыянал-апартуністычны і правaапартуністычны хлам з сацыялістычнай дарогі.

На шляху выкананьня пляноў сацыялістычнага будаўніцтва мы будзем сустракацца і надалей з вялікімі труднасьцямі, на перамаганьне якіх мы павінны мабілізаваць максымальную ўвагу ўсёй пралетарскай, партыйнай і савецкай грамадзкасьці.

Вопыт мінулых гадоў паказаў, што рабочая кляса і наша пралетарская дзяржава маюць неазьмерна вялікія крыніцы энэргіі, мабілізаваўшы якія мы можам рухаць сацыялістычнае будаўніцтва нячувана вялікімі тэмпамі. Таму нашай задачай зьяўляецца мабілізаваць усё гэтыя скрытыя энэргетычныя і матар'яльныя рэсурсы на пасьпяховае выкананьне народна-гаспадарчага пляну 3-га рашаючага году пяцігодкі.

Х

Задачы вызначаны гіганцкія. Іх выкананьне магчыма толькі пры тых умовах, калі ўся рабочая кляса і ўсе савецкія і гаспадарчыя арганізацыі, увесь савецкі апарат зьверху да нізу будуць праводзіць выразную клясавую лінію, лінію ленінскай партыі. Таму праца ўсіх савецкіх і гаспадарчых органаў і савецкага апарату, які зьяўляецца асноўным інструмантам дзяржавы пралетарскай дыктатуры і які павінен выразна праводзіць лінію нашай партыі, набывае асабліва важнае значэньне.

Трэба мець на ўвазе, што для таго, каб выканаць з посьпехам усе пастаўленыя задачы, патрэбна неадкладная перабудова работы савецкага апарату. устанаўленьне ў ім цьвёрдай дысцыпліны, ачышчэньне яго ад апартуністычных, шкодніцкіх і бюракратычных элемэнтаў, накіраваньне асноўнай увагі ўсіх савецкіх органаў у бок праверкі выкананьня дырэктыў партыі і савецкага ўраду. Трэба, як кажуць, падцягнуцца ўсім зьвеньням савецкага апарату, перабудаваць на баявы лад.

Трэба ў першыя-ж месяцы 1931 году дабіцца ліквідацыі вынікаў шкодніцкай дзейнасьці контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў, якія занесьлі свае нацыянал-дэмакратычныя пляні ў паасобныя зьвенні савецкага, гаспадарчага і культурнага апарату.

Такім чынам, да новых перамог з новымі сіламі—у бой за сацыялізм разгорнутымі пралетарскімі шарэнгамі па шляху, які нам паказвае ленінск. ЦК УсеКП(б) і яго правадыр тав. Сталін. Пашырым і ўзмоцнім фронт сацыялістычнага наступленьня і ў горадзе і ў вёсцы. Ліквідуем кулацтва як клясу на базе суцэльнай калектывізацыі.

Мільёны новых калгасьнікаў панясуць наперад

У ТРЭЦІМ ГОДЗЕ ПЯЦІГОДКІ СЬЦЯГ СУЦЭЛЬНАЙ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

ТРЭЦІ РАШАЮЧЫ ГОД ПЯЦІГОДКІ БУДЗЕ ГОДАМ НОВЫХ БУЙНЕЙШЫХ ПЕРАМОГ НА ШЛЯХУ СУЦЭЛЬНАЙ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ І ЛІКВІДАЦЫІ НА ГЭТАЙ БАЗЕ КУЛАЦТВА ЯК КЛЯСЫ

ЛЕПШЫ З ЛЕПШЫХ

Э гонарам нясем імя Кастрычніка

Пад сьцягам ударніцтва і сацспаборніцтва

Калгас «Кастрычнікавая Рэвалюцыя», Ратамскага сельсавету, Заслаўскага раёну, арганізаваны ў лютым 1930 году з батрацка-бядняцкай часткі насельніцтва. У сакавіку калгас зліўся з Качынскім калгасам, а ў чэрвені—з калгасам «8 сакавіка». У сучасны момант калгас яднае наступныя населішчы: пас. Ратамку, вёскі Баньчуйчыну, Міхроўку, Качына і Отруг агульнаю ў 1000 га. Гаспадараў з жаночкамі ў калгасе налічваецца 1437.

Веснавую пасеўную кампанію калгас сустрэў арганізавана, своячасова прыступіў да выкананьня вызначанага заданьня. Дзякуючы ўмеламу кіраўніцтву праўленьня калгасу і энтузіязму калгасьнікаў, заданьне па веснавой пасеўкампаніі выканана з перавышэньнем: пасеўплошча пашырана на 27 проц.

Уся работа праводзілася на падставе ўдарніцтва і сацыялістычнага спаборніцтва з суседнім калгасам імя Варашылава. У результаце энэргічнай работы ўсяго складу калгас «Кастрычнікавая Рэвалюцыя» мае добрыя вынікі. Калгасам сабраны наступны ўраджай: жыта 189 тон, аўса 194 тоны, ячаніцы 23 тоны, ячменю 27,5 тоны, канчашыны і сена 98,5 тоны, бульбы 315,5 тоны, коранплодаў 47 тон, гароху 22 вазы, грэчкі 9 вазоў і засілаванага зялёнай масы 140 куб. м.

Калгас «Кастрычнікавая Рэвалюцыя» выканаў усе свае заданьні своячасова і на бальшавіцку. Замест вызначанага па пляну азімага кліну ў 170 га, «Кастрычнікавая Рэвалюцыя» засеяла 224 га, што складае 132 проц. заданьня. Вызначанае заданьне па хлебазагатоўках у 19 тон, выканана калгасам з перавышэньнем на 2 тоны. Калгас, своячасова здаўшы свае лішкі, выклінуў на сацспаборніцтва рад калгасаў і аднаасобнікаў. Улічваючы напружанае фінансавае становішча ў краіне, калгас «Кастрычнікавая Рэвалюцыя» поўнасьцю здаў ны твар,—як агенту[illegible] агентуры польскага [illegible] падатак і стратарыят пад кіраўніцтва[illegible]іцы сабе зна[illegible] маску са шпіёнаў [illegible]кі—саюзнікаў шко[illegible]годка—у чатыры [illegible] на падпісаліся на

Створана моцная вытворчая база

Калгас мае малочна-птушкаводны напрамак. Колькасьць жывёлы на 25 кастрычніка г. г. наступная: кароў дойных 100 галоў, быкоў 4 і маладняку 42 гал., маладняку да 1 году—60 галоў. Корміцца і даглядаецца жывёла вельмі добра.

Сіламі калгасьнікаў пабудавана абора на 100 галоў і сіласная вежа на 300 тон. Калгас мае 78 добрых коняй і 21 штуку маладняку; коні таксама знаходзяцца ў добрым становішчы, за імі здзяйсьняецца дагляд і даецца добры корм.

Пры калгасе ёсьць торфараспрацоўкі, чарапічны завод і млын з 8 сіламым рухавіком. Па сваіх прадпрыемствах калгас здабыў наступную прадукцыю: на торфараспрацоўках здабыта 1200 кб. саж. торфу, на цагельні—300 тысяч штук цэглы.

Па пляну калгасу на зімовы час прадугледжана вялікае будаўніцтва. Калгас мяркуе набудаваць новае памяшканьне для млына з устаноўкай рухавіку ў 25 сіл, набудаваць жывёлаборы на 200 галоў і сьвіран.

Калгас «Кастрычнікавая Рэвалюцыя» зьвярнуў максімум увагі на пытаньне грамадзкага харчаваньня. Да дню 13 гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі калгас адкрыў сталоўку з поўным абслугаваньнем.

Уся работа калгасу праходзіць у напрамку строгае арганізацыі працы. Калгасьнікі своячасова зьяўляюцца на работу. Працадысцыпліна ў калгасе займае гаварове месца.

Яшчэ з раньняй вясны калгасам заключана ўмова на сацспаборніцтва з іншымі калгасамі. Створаны ўдарныя брыгады ў калгасе і на вытворчасьці. Адстаючая частка калгасьнікаў бярэцца на грамадзкі буксір праз агульныя сходы калгасьнікаў.

Калгас таксама зварочвае адпаведную ўвагу і на культурыхаваўчую работу сярод калгасьнікаў. Пры калгасе ёсьць культурна-бытавая камісія, якая праводзіць сваю работу разам з сельсаветам. Па брыгадах калгасу выпісваюцца газэты. Амаль што ўсе калгасьнікі падпісваюць газэты. Па зімовы час калгас арганізуе курсы з напрамкам культурна-бытавым і сельска-гаспадарчым.

Героі калгасных будняў

Старшынёй калгасу зьяўляецца бядняк в. Качына т. Пратаповіч. Да ўступленьня ў калгас меў усяго 0,5 га зямлі. Пратаповіч увесь час працаваў на сваёй гаспадарцы. Мае адукацыю сельскай школы. Кандыдат у члены КП(б)Б. Цяжкасьці, якія ён сустракаў на шляху будаўніцтва калгасу, не паслаблялі энтузіязму Пратаповіча. Наадварот, чым больш цяжкасьцяй, тым больш энэргіі, энтузіязму і агню да іх перамогі зьяўлялася ў яго. У выніку гэтага на сёньняшні дзень мы маем добрае становішча, якое дае права калгасу прымаць удзел ва Ўсесаюзным конкурсе. Тав. Пратаповіч гарыць агнём у рабоце. Ён прымае актыўны ўдзел і ў савецкай рабоце. Няма ніякай кампаніі, якая-б прайшла без удзелу Пратаповіча. Сам Пратаповіч жыве ў в. Качына, але дома мала бывае. Яго жыцьцё—гэта калектыўная гаспадарка «Кастрычнікавая Рэвалюцыя». Тав. Пратаповіч карыстаецца вялікім аўтарытэтам як сярод калгасьнікаў, так і аднаасобнікаў. Ён мае добры падыход да кожнага таварыша ў пасобку, чаму ўсе пазажаюць тав. Пратаповіча. Высунуты на кіруючую работу, бядняк Пратаповіч сябе цалкам апраўдаў.

Намесьнік старшыні калгасу тав. Сухадольскі паходзіць з серадняцкай сям'і. Да 1907 году працаваў на гаспадарцы, з 1914 году працаваў на вытворчасьці з 1915 году па 1921 год служыў у б. царскай, а потым у Чырвонай арміі, а з 1921 г. па 1930 г. працаваў у Ратамскай спажывецкай кааперацыі. Пры арганізацыі калгасу тав. Сухадольскі пачаў працаваць намесьнікам старшыні. Ён любіць гэтую гаспадарку і дае гаспадарцы вялікую карысьць сваім уменьнем весьці яе. Тав. Сухадольскі прымае вялікі ўдзел у савецкай і грамадзкай рабоце. Ніводнага сходу на вёсках не праходзіць, каб Сухадольскі ня быў на адным з іх.—Вечна на працы, нават сну на яго няма,—так гаворыць пра яго сялянне. Тав. Сухадольскі карыстаецца аўтарытэтам сярод калгасьнікаў. Ён ня толькі добры кіраўнік-адміністратар, але і добры старайшы таварыш.

Калгасьнікі «Кастрычнікавай Рэвалюцыі», дзякуючы правільнаму і ўмеламу кіраўніцтву з боку праўленьня, пры актыўнай дапамозе і непасрэдным кіраўніцтве мясцовай партыйнай ячэйкі, выкавалі з невялікага калгасу магутны і моцны калгас. Бірштэйн.

Буйнейшыя посьпехі калгасу „Асьвет"

Вясной у калгасе «Асьвета» налічвалася 36 гаспадараў, цяпер налічваецца 91 гаспадарка. Але гэта ня ўсё, з кожным днём у калгас улічваюцца новыя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі.

Калгас мае 118 кароў, 51 штуку маладняка, коняй—94, сьвіней—127 і авечак—199. Большая частка жывёлы, асабліва кароў і сьвіней, набыта калгасам.

З асеньняй пасеўнай кампаніяй калгас справіўся своячасова. Зімовы клін навінен складаць 65 га, а засеялі жытам 85 га і пшаніцай 12 га. Пляні зяблевай успашкі выканалі, узялата 100 га.

Заданьне па загатоўках калгас раней за ўсіх, перавыканаў: на зярнёвых чавіна быў здаць 40 тон, а здаў 88 тон, альбо 221 проц., па бульбе заданьне 100 тон, а здаў 160 тон, альбо 152 проц. Гэтыя лічбы гавораць аб росьце і ўзмацненьні гаспадаркі. Апрача гэтага, калгас дае для абмену суседняму насельніцтву гатуковага аўса 33 тоны.

Будаўніцтва сваё калгас выконвае пасьпяхова. На сёньня пабудаваны: сьвінарнік на 50 матак, другі сьвінарнік на 102 сьвінаматак, стайня на 60 галоў, рамонтная майстэрня, будынак для школы і арганізавана сталоўка на 70 асоб.

Калгас набыў поўны пажарны абоз, які абслугоўвае і суседняе насельніцтва. Ужо некалькі разоў пажарны абоз калгаса ліквідаваў пажары (Рачонь і Закальнае). Пры калгасе створана пажарная дружына ў 43 асобы. Пры калгасе ёсьць дзіцячыя ясьлі на 40 дзяцей.

Вялікую работу калгас праробіў па пашырэньню пасеўнай плошчы, за восень раскапана 15 га балота і 7 га залежаў.

Падпіска на пазыку «Пяцігодка—у 4 гады» прайшла пасьпяхова, калгасьнікі падпісаліся на 1635 руб. і ўнесьлі матавых укладаў 2600 руб.

Культпраца ў калгасе наладжана добра. Чырвоны куток калгасу наведваюць і некалгасьнікі.

Усе праведзеныя лічбы і факты гавораць, што калгас на поўным ходу будаўніцтва сацыялістычнай гаспадаркі. Калгас «Асьвета» прыцягвае да сябе ня толькі суседняе насельніцтва, але і бядняцкую і серадняцкую іншых раёнаў.

Зайцаў.

Любаньскі раён.

МТС—фарпосты сацыялістычнага наступу

КОЙДАНАЎСКАЯ МТС ПАДРЫХТОЎВАЕ СВОЙ ТРАКТАРНЫ ПАРК ДЛЯ РАМОНТУ.

Народжаны ў агні клясавай барацьбы

Даёш калгас!

Купінамі абрасла зямля В.—Сьмілаўскага сельсавету, і купіны гэтыя—сталыпінскія хутары. Шмат іх, і не аднолькавыя яны; адны—на лепшых вучастках, глыбока ўніліся карэньнем у зямлю, смяхталі беднату, упрыгожваліся звонкімі будынкамі, другія шэранькія, «сьляпыя» халупачкі, у якіх доўгія гады пакутвала беднота. Як ня б'ецца, як не стараецца бядняк на сваёй лапінцы-палосцы, а ня можа ён выбіцца на дарогу значнага палепшаньня свайго матар'яльнага становішча.

Ужо каторы год, як савецкая ўлада стала—беднята падатак ня плаціць, усялякія ільготы, а выбіцца «у людзі» сіл няма. Як ня круці, а больш чым да каляд хлеба не хапае. Лапінкі-палоскі, яны зьвязалі па руках і па нагах бедняка, ды і серадняку ня так лёгка ўзьнімаць матарыяльны ўзровень свайго жыцьця.

Цярпець такое жыцьцё больш няможна. Трэба шукаць выйсьця.

Ня раз беднякі і сераднякі чулі даклады, гутаркі ды парады членаў мясцовай партыйнай ячэйкі аб калгасе. Спачатку баяліся, ня рушыліся з месца і толькі ў сакавіку 1929 г. пераканаліся, што для бядняцка-серадняцкага сялянства адзіны выхад—калектывізацыя.

І вось 20 сакавіка 1929 г. са сходу разыходзілася 28 беднякоў і сераднякоў В.-Сьлівы, перад імі стаяла выразная мэта:

— Даёш калгас!

Арганізацыя калгасу была зьвязана з разбурэньнем кулацкага гнязда, якое разьмясьцілася ў цэнтры хутароў на добрай зямлі. Не хацелася кулаччу злазіць з насіджаных, цёплых котлішчаў. Але беднята напірала. Ня раз і прадстаўнікі рабочага прыяжджалі на месца. Прыедуць, бывала, паківаюць галавамі, а земляпараджаваньня не пачынаюць.

Дні бягуць. Надыйшла сяўба. Радуюцца кулакі, думаюць, што калгас «трэсьне». Але ўпэўненыя ў перамогу, будучыя калгасьнікі ня трацілі надзей. Ня гледзячы на запалохваньні кулацтва, яны, на чале з мясцовай партыйнай ячэйкай, пачалі калектыўную сяўбу на сваіх аднаасобных палосках.

Толькі ў пачатку лістапада пасьля чатырох месяцаў ўпартай барацьбы з кулаком ды апартуністамі калгасьнікі вяроўкаю адвялі пад вокнамі ў кулакоў вучастак для будучай сядзібы. Тут-жа паставілі пяць купленых і перавезеных сваіх хат.

Увосень малады народжаны ў агні клясавай барацьбы калгас «Чырвоны Працаўнік» ужо на справе паказаў перавагу буйнай гаспадаркі заснаванай на добраахвотнай працы: сярод раскіданых хутароў зацьвіў бляшэным дахам прасторны калгасны хлеў на 90 кароў.

Да часу асеньняй сяўбы калгасьнікам было адведзена 240 га сенажаці. Калгасьнікі па-бальшавіцку ўзяліся за калектыўную сяўбу жыта і выканалі гэтую работу з посьпехам.

Да абагуленых яшчэ вясной коняй пачалі калгасьнікі пасьля сяўбы далучаць абагуленых кароў і сьвіней.

Калгас цьвёрда стаў на ногі

Прароцтвы кулакоў аб лодырах, дармаедах ды развале калгасу дашчэнту разьбіліся аб адданую, напорыстую працу калгасьнікаў. Рэшткі беднякоў ды сераднякоў упэўнена ўлілася ў калгас. Кулакі прыхусілі языкі, моўчкі чакалі вынікаў ад «працы» ў калгасе свайго стаўленьніка-сэктанта Самусэвіча Дзяніса, які праляз у праўленьне калгасу і меў на мэце стаць арганізатарам кулацкай ілжэарцелі.

Але і гэта «палітыка» была выкрыта і Самусэвіч выляцеў ня толькі з праўленьня, але і з калгасу.

Цяпер калгас «Чырвоны Працаўнік»—адзін з буйных і моцных калгасаў Случчыны. У ім—63 гаспадаркі. У калгасе ёсьць 605 га зямлі, з якіх 279 пахаці, а астатняя—сенажаць і сядзіба; ёсьць 89 кароў, 39 коняй, 130 сьвіней, 152 авечак. Ня мала ў калгасе складаных сельскагаспадарчых машын. Калгасьнікі маюць сваю кузню і вятрак на два паставы. У калгасе добра наладжана рахункаводзтва, якое дае магчымасьць лёгка вырашыць справу разьмеркаваньня прыбыткаў. Калгас па баявому правёў уборку збожжа і сенажаці. Усё гэта сьведчыць аб тым, што «Чырвоны Працаўнік», наперакор кулаччу, наперакор хныканьню апартуністаў стаў цьвёрда на ногі.

Перамагаць цяжкасьці, браць тэмп!

Побач з дасягненьнямі ёсьць у калгасе і рад недахопаў. У ім да гэтага часу няма сталага севазвароту і, як вынік, яшчэ ня выпрацаваны нормы выпрацоўкі. Праўда, праца аплачваецца па 5 разраднай сетцы, але гэта ня вырашае задачы ацэньваць працу і па колькасьці, і па якасьці.

У калгасе былі прарывы ў справе будаўніцтва, уборкі і сяўбы. Спазьніліся з уборкай бульбы, слаба ішла сяўба і набудова сьвінарніка.

Усё гэта пры адсутнасьці дастатковай колькасьці рабочай сілы і, галоўнае, пры наяўнасьці надзвычайна няспрыяючага надвор'я стварала значную цяжкасьць, перамога якой патрабуе адданай напружанай працы. А між тым былі выпадкі, калі калгасьнікі не згаджаліся выбіраць бульбу за плугам, хацелі капаць лапатамі, што зьмяншала тэмпы ўборкі бульбы.

Вялікім недахопам у працы калгасу зьяўляецца тое, што ён не рабіў справа здачы перад аднаасобнікамі. Вынікам гэтага трэба лічыць адсутнасьць значнага прыліву.

Заваёўваць аднаа обніка—бедняка і серадняка!

Але, ня гледзячы на рад недахопаў, калгасьнікі «Чырвонага Працаўніка» маюць добрыя вынікі ад ударнай працы. Іх рабочы дзень аплачіцца ў сярэднім у 2 руб. 35 кап. У выніку гэтага прыбытак сярэдняй гаспадаркі, увайшоўшай у калгас у параўнаньні з прыбыткам індывідуальнай такой-жа гаспадаркі, у 2 разы большы. І гэта пры адсутнасьці тракторных усякіх.

Цяпер калгасьнікі падпісаліся на трактарныя акцыі на суму 2.400 руб. З будучай вясны калгас будзе забясьпечаны трактарамі і поўнай мэханізацыяй вытворчых працэсаў. Усё гэта значна палепшыць становішча калгасьнікаў і выкліча новы магутны прыліў у калгас.

І. Ногіч.

Слуцкі раён.

Рашучы паварот саветаў ДА ЗАДАЧ ТРЭЦЯГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ

„Неабходна, каб саветы па-сапраўднаму павярнуліся тварам да ўдарніцтва, тварам да калгасаў"

(З рэз. плен. ЦК і ЦКК УсеКП(б)

Ударнікі—члены гарсавету

Тав. Табула член Гарсавету ад заводу «Камунар» працаваў у сэкцыі РСІ, у якой прымаў актыўны ўдзел. Як загатчык цэху заводу «Камунар» ён сябе апраўдаў поўнасьцю. Сьлесарны цэх, які ў першым паўгодзьдзі ня выканаў прамфінплян, зараз лічыцца першым на заводзе. А ў асобным квартале па ўсіх галінах работы сьлесарны цэх, загадчыкам якога тав. Табула, зьяўляецца, перадавым.

Гарсавет, тварам да вытворчасьці!

Лепшых ударнікаў у савет

ГОМЕЛЬ, 27-XII. Правядзеньне справаздачных сходаў гарсавету заканчваецца, пачаліся перавыбарчыя. На перавыбарчы сход рабочых Палесдруку зьявілася амаль 100 проц. выбаршчыкаў, брыгада прадугледжанага рамонту дэпо ст. Гомель-гасп. дала 95% яўкі і г. д. Абгаварэньне наказаў вельмі актыўна. АСНОЎНЫ ПУНКТ НАКАЗУ ГАРСАВЕТУ АД РАБОЧЫХ—ПАВЯРНУЦЦА ТВАРАМ ДА ВЫТВОРЧАСЬЦІ.

У гарсавет абіраюцца лепшыя ўдарнікі з вялікім вытворчым стажам. На справаздачным сходзе пічацінай фабрыкі пяць рабочых ударнікаў з вялікім вытворчым стажам падалі заяву аб прыёме іх ў партыю.

Паслаць у гарсавет лепшых ударнікаў

Справаздачныя даклады Мангарсавету і дэпутатаў на заводзе «Камунар» прайшлі пры актыўным удзеле рабочых заводу.

Для пасьпяховага правядзеньня гэтай важнейшай палітычнай кампаніі заўкомам заводу «Камунар» праведзена вялікая падрыхтоўчая работа. Да 25 лістапада была створана брыгада, якая распрацавала плян правядзеньня справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў, а ў цэхах арганізаваны тройкі, якім даручана правесьці работу з рабочымі пад кутом перавыкананьня прамфінпляну, удзелу ў конкурсе на лепшае прадпрыемства і падрыхтоўцы да трэцяга году пяцігодкі—ўвязаўшы ўсю гэтую работу са справаздачна-выбарчай кампаніяй Гарсавету.

Для падрыхтоўкі да гэтай кампаніі праведзены па ўсіх цэхах і зьменах гутаркі аб значэньні перавыбараў Гарсавету. Для ўдзелу ў правядзеньні справаздачнай кампаніі на заводзе «Камунар» прыцягнуты пінэры, якія абыходзілі ўсе цэхі, распаўсюджвалі лістоўкі, разьвешвалі адпаведныя плякаты і лёзунгі.

Шырока разгорнута сацспаборніцтва паміж усімі цэхамі. Кожны цэх абавязаўся ўнесьці ня менш 30 прапаноў да наказу нанова абраным членам Гарсавету і 50 вытворчых прапаноў да палепшаньня прадукцыйнасьці заводу. У выніку гэтага мы маем: плян рацыяналізацыі на 1931—трэці рашаючы год пяцігодкі — складзены выключна на грунце рабочых прапаноў, вялікі паток рабочых прапаноў да сустрэчнага прамфінпляну першага кварталу. На агульна-завадзкім сходзе рабочых заводу «Камунар» пастанавілі: выклікаць на сацспаборніцтва на лепшае правядзеньне справаздачна-выбарчай кампаніі гарсавету рабочых заводу «Энэргія».

Асноўныя пункты сацдагавору—100 проц. наведваньне сходаў справаздачна-перавыбарчай кампаніі гарсавету, даць ня менш 100 прапаноў ў новы наказ гарсавету; правесьці на цэхах сходы ўдарнікаў, на якіх абгаварыць выкананьне прамфінпляну і задачы трэцяга рашаючага году пяцігодкі і шэраг іншых пунктаў.

Зараз брыгады робяць праверку выкананьня старога наказу Гарсавету і выбіраюць матар'ялы да новага наказу.

Па ініцыятыве камсамольскага калектыву праведзены на заводзе «Камунар» суботнікі па збору лому.

Наша задача даць у новы Гарсавет лепшых ударнікаў нашага заводу, якія будуць на практыцы няўхільна праводзіць генэральную лінію партыі.

Д. М—ў.

Стаць сапраўдным штабам калектывізацыі

Справаздачна-перавыбарчая кампанія саветаў па нашым раёне ў шмат якіх саветах заканчваецца.

Падрыхтоўчая работа да перавыбараў саветаў пачалася яшчэ ў першыя дні лістапада. Было праведзена шмат сходаў і нарад актыву, беднаты. У справаздачна-перавыбарчую кампанію шырака разгарнулася работа па правядзеньні савецкай эстафэты, дзякуючы чаму вакол гэтай кампаніі скан цэнтравана ўвага асноўных мас выбаршчыкаў.

Праводзяцца сходы беднаты і абгаворваецца наказ і кандыдатуры ў новы склад саветаў. Праведзены сходы жанчын, у часе якіх былі арганізаваны аднадзенныя дзіцячыя ясьлі. Дзякуючы добра праведзенай падрыхтоўчай рабоце, яўка выбаршчыкаў на справаздачна-выбарчыя сходы складала 80—90 проц. прычым асобая актыўнасьць выяўляецца з боку жанчын, якія бяруць справаздачу сельсавету пад агонь жорсткай самакрытыкі. Пры правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі адначасова праводзяцца і іншыя гаспадарчыя кампаніі (загатоўчая, мабілізацыя сродкаў і г. д.), якія даюць добрыя вынікі.

У Завячэльскім сельсавеце ў часе справаздачна-выбарчага сходу, на якім абгаворваўся наказ новаму складу савету, кулацкія падпявалы спрабавалі выступаць супроць увядзеньня ў наказ пунктаў аб калектывізацыі, але асноўныя масы выбаршчыкаў гэтым кулацкім выступленьням далі рашучы адпор.

Батрацтва, беднята, калгасьнікі лепшая частка серадняцтва заявілі, што Завячэльскі сельсавет павінен стаць і стане сапраўдным штабам калектывізацыі.

Селькор Янка.

Вушацкі раён.

На ўзмацненьне саветаў

Слуцкі РК КСМ для ўзмацненьня работы саветаў мабілізаваў на сталую працу ў якасьці сакратароў сельсаветаў 10 камсамольцаў, з якіх 7 камсамольцаў едуць у іншыя раёны: Старобінскі, Чырвона-Слабодзкі і Глускі. Я.П.

Ударнікі—члены гарсавету

Тав. Скрыпко, член Гарсавету ад заводу «Камунар», працаваў у камісіі Гарсавету. Тав. Скрыпко прарабіў вялікую работу ў справе наладжваньня грамадзкага харчаваньня, палепшаньня работы МЦРК—па масавым абслугоўваньні сталовак, складаў і крам МЦРК.

На заводзе тав. Скрыпко працуе ў якасьці загатчыка кантрольным аддзелам. За год існаваньня аддзелу маецца шмат дасягненьняў у палепшаньні якасьці прадукцыі.

Манэўр кулацтва ня ўдаўся

21-га сьнежня адбыўся справаздачна-перавыбарчы сход калгасу «Чырвоная Сякераўшчына» і вёсак Сякераў шчына I і II Бурцы. На сход зьявілася 80 проц. выбаршчыкаў.

Справаздача сельсавету была абгаворана жарка. З цікавасьцю быў заслуханы і даклад калгасу.

У час выбараў членаў сельсавету былі спробы падкулачнікаў праваліць кандыдатуры, якія рэкамандаваліся ад імя партыйнай ячэйкі і беднаты. Заможнікі замест гэтых кандыдатур імкнуліся правесьці сваё, з ліку тых, хто варожа адносіцца да мерапрыемстваў рабочай улады, асабліва да калектывізацыі.

Але спробы падкулачнікаў пацярпелі паражэньне. Сход іх выказам даў рашучы адпор. Кандыдатуры рэкаманд аваныя партыйнай ячэйкай і беднатой у склад сельсавету былі абраны поўнасьцю.

А. Тайоель.

Полацкі раён.

Пераможнымі крокамі

Калгас «Чырвоны Кастрычнік» аб'яднае 38 гаспадараў. Калгас арганізаваўся 15 красавіка 1929 г. У калгасе ёсьць батрачкі-адзіночкі і ўдовы з сем'ямі. Аб іх жыцьці можна ўявіць са слоў удавы Нечанковай Вольгі, якія яна сказала на агульным сходзе:

— Калі арганізаваўся калгас, дык я варажыла: ці ўступіць у калгас, ці не? Застацца некалгасьніцай—жыцьцё не салодкае, адна з дзяцьмі. Але пашлі нашы суседзі, ну, і я рашыла пайсьці. Пачала працаваць з усімі тое, што магу, і думала: ці зараблію што небудзь? Але старшыня калгасу т. Кірылаў, наш сусед, кажа:—Тое, што наробім, падзелім паміж сабою, а лішкі дзяржаве прадамо. Прышоў час разьмяркаваньня ўраджаю,—пачалі разьмяркоўваць, што нарабілі. Я працавала са сваімі дзяцьмі, прапрацавала ўсяго 1233 дні. Мне прышлося на сям'ю 95 пудоў жыта, 50 пудоў аўса, 35 пуд. ячменю, 10 пуд. ашаніцы, 463 пуд. бульбы і 141 руб. 50 кап. грашыма.

Далей Вольга гаворыць:

— Атрымала я, што зарабіла, і думаю, што тэтага-б я ніколі не зарабіла, жывучы асобна. Для мяне зарна і хлеба і бульбы хопіць, ёсьць таксама і шаніца на бліны. Аб карове і парасяці я не клапачуся—бульба ёсьць, а сена таксама дадуць. Цяпер хоць-бы хто сказаў выйсьці з калгасу, ніколі не пайду. Мне ня трэба нічога прасіць у кулака, каб ён памог, усё ў нас ёсьць. І калі хто мне скажа, што ў калгасе дрэнна, я плюну яму ў твар.

Гэтае самае кажа і батрачка Галаўнёва Ганна. Галаўнёва Ганна атрымала на адну душу: 2,3 цэнтнэры жыта, 1,2 цэнт. аўса, 1 цэнтн. ячменю, 0,3 цэнтн. ашаніцы, больш тоны бульбы і 20 р. грашыма.—Хіба гэта я атрымала-б, працуючы ў кулака5—запытваецца Галаўнёва і сама адказвае:—Ніколі!

У гэтым калгасе жанчыны і мужчыны ўжо ліквідавалі няпісьменнасьць. Яшчэ летась настаўніца хадзіла да іх на кватэру і вучыла. Зараз яны самі могуць ня толькі расьпісацца, але і весьці вучот працы ў калгасе. Сёлета арганізаваны гурток мазапісьменных, які яшчэ больш дасьць магчымасьць жанчыне ўдзельнічаць у будаўніцтве.

Г. Шумілаў.

Шклоўскі р-н.

Пад сьцяг калгасаў!

⊙ СЯЛЯНЕ ВЁСКІ ЎЗБАРОГІ і ЎБОРКІ, Пятровіцкага сельсавету, АРГАНІЗАВАЛІ КАЛГАС ІМЯ КАЛІНІНА. Зямельная плошча гэтага калгасу—звыш 230 га. Увайшоўшыя ў калгас сяляне зараз-жа прыступілі да працы, абагуленыя рабочай жывёлы, насеньфонду і сельска-гаспадарчага інвэнтару, які мяркуюць як мага хутчэй адрамантаваць.

На аснове ленінскага прынцыпу добраахвотнасьці арганізаваны яшчэ два калгасы. Праводзіцца растлумачальная работа сярод неарганізаванага працоўнага насельніцтва. Створаны тры ініцыятыўныя групы, а таксама 6 малочна-жывёлагадоўчых таварыстваў, якія прыступілі да практычнай работы.

Сьмілавіцкі р. ДЗІДА.

⊙ Пасьля справаздач калгасаў перад аднаасобнікамі, беднякі і сераднякі пачалі пераконвацца ў перавазе буйнай калектыўнай гаспадаркі перад дробнай сялянскай і ўзьнімаюць прыліў у калгасы. Так, за АПОШНІ ЧАС Ў 3 КАЛГАСЫ ЎЛІЛОСЯ 27 АДНААСОБНІКАЎ, АПРАЧА ГЭТАГА Ў В. ГУРЫНЫ АРГАНІЗАВАЎСЯ НОВЫ КАЛГАС ІМЯ ГАЗЭТЫ «ПРАВДА».

Нараўлянскі р-н. В. Г.

⊙ 22-XII на агульным сходзе калгасьнікаў калгасу «Чырвоны Кастрычнік», Аршанскага раёну, РАЗГЛЯДАЛІСЯ ЗАЯВЫ СЯЛЯН АБ ПРЫНЯЦЬЦІ ІХ У КАЛГАС. Агульны сход прыняў у калгас тры гаспадаркі з агульным жжам 12 чалавек і аднаго адзіночку.

У. С.

⊙ Беларускі сельсавет, Астрашынка-Гарадзенскага раёну праводзіць сапраўднае кіраўніцтва калгасным рухам. У ВЫНІКУ БАЛЬШАВІЦКАЙ РАБОТЫ СЕЛЬСАВЕТУ ГАСПАДАРКІ СЕЛЬСАВЕТУ ЎЖО КАЛЕКТЫВІЗАВАНЫ НА 60 ПРОЦ. тады, як на раёне гаспадаркі калектывізаваны на 38 проц. Беларускі сельсавет па калектывізацыі займае першае месца ў раёне. ДЗЯМЕНЧАНКА.

⊙ У калгасе імя Сталіна нядаўна адбыўся агульны сход калгасьнікаў, на якім ЗНОЎ ПРЫНЯТА 5 НОВЫХ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК. Адразу на заўтра калгасьнікі пайшлі на работу. Прыліў у калгас спрыяе прыкладнасьць калгасу і правільнае правядзеньне генэральнай лініі партыі. Гаварову назву калгасу мы апраўдаем.

Самахвалавіцкі р-н. М. ПІСКУН.

⊙ Калгас «Трактар» пасьпяхова справіўся з усімі кампаніямі. Будаўніцтва хлева для кароў на 150 галоў скончана, сьвінарніка на 100 сьвінаматак—таксама скончана, другая палова сьвінарніка ў бліжэйшы час будзе скончана.

Малацьба, як сёньняшняя ўдарная работа, ідзе к канцу. Пры абмалоце аўса выявілася, што капа дае 7-8 пуд., а ў аднаасобнікаў толькі 4-5 пуд.

Гэта паказвае на ладвышэньне калгаснага ўраджаю ў параўнаньні з сёньняшнім аднаасобнікам. ВАКОЛІЧНАЕ СЯЛЯНСТВА навочна пераконваецца ў перавазе калектыўнай гаспадаркі і ПАЧЫНАЕ ЎСТУПАЦЬ У КАЛГАСЫ

Слуцкі раён. СВОЙ.

⊙ У в. ПАНІЗОЎЕ, Уланаўскага сельсавету, АРГАНІЗАВАЎСЯ КАЛГАС, У ЯКІ ЎСТУПІЛА ЦАЛКАМ УСЯ ВЁСКА. Да сёньняшняга дню гэты калгас не аформлены. Калгасьнікі амаль кожны дзень прыходзяць у сельсавет за дапамогай, але-ж на іх ніхто не зварочвае ўвагі.

Шклоўскі раён. В. Н.

Уключаемся ў калгасную сям'ю

Новаабраны член сельсавету—на чале арганізацыі ініцыятыўнай групы

У вёсцы Русінаўскія і Міхайлаўскія Вуглы да восені ня было ніводнага калгасьніка.

У час справаздачна-перавыбарчай кампаніі с.-с. на справаздачным сходзе была створана ініцыятыўная група па арганізацыі калгасу ў в. Вуглах, у якую запісалася 6 асоб, сярод якіх і новаабраны член с.-с. бядняк МЫСЬЛІВЕЦ ЯСЬКА. Характарнае выступленьне на сходзе ў час правядзеньня запісу ініцыятыўнай групы 70-гадовага сівога дзеда, таксама бедняка, які сказаў:

— МЫ ВЫГНАЛІ БУРЖУЯЎ І КАПІТАЛІСТАЎ, ДЫК ДАВАЙЦЕ З ТАКОЙ ЖА СІЛАЙ ЎДАРЫМ І ПА ТЫХ НАШЫХ УНУТРАНЫХ ВОРАГАХ, ЯКІЯ ПЕРАШКАДЖАЮЦЬ БУДАВАЦЬ НАМ НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ.

Дзед гэты—банька члена сельсавету, які з гаспадаркаю запісаўся ў калгас. Словы дзеда былі спатканы гучнымі воплескамі.

У будучую веснавую пасеўкампанію вёскі Русінаўскія і Міхайлаўскія Вуглы ўключыцца ў калгасную сям'ю.

ПРЫСУТНЫ.

Самахвалаўскі р.

КАПІТАЛЬНЫ УКЛАД

У ТРЭЦІ РАШАЮЧЫ ГОД ПЯЦІГОДКІ

У адказ інтэрвэнтам і іх агэнтам—беларускім контррэвалюцыйным нацдэмам рабочыя і працоўныя масы БССР пад непахісным кіраўніцтвам КП б)Б упэўнена будуюць культуру нацыянальную па форме і сацыялістычную па зьместу

Рапарт штаба менскіх культманэўраў

Навучальны год па г. Менску пачаўся і вераснем і меў цэлы рад недахопаў як у галіне забесьпячэньня школ навучальнымі праграмамі, падручнікамі, так і поўнага ахопу дзяцей школай, падлягаючых усеагульнаму абавязковаму навучанню.

Ня лепш справа стаяла і ў галіне ліквідацыі няпісьменнасьці і інтэрнацыянальна-клясавага і антырэлігійнага выхаваньня як у школах, так і ў дашкольных установах.

Адозва ЦК УсеКП(б) ад 3 кастрычніка заклікала пралетарскія масы на барацьбу з прарывамі і забесьпячэньне выкананьня вытворчай праграмы 3 году пяцігодкі, выклікала сялікую актыўнасьць працоўных мас, асабліва перадавой часткі асьветнікаў, мабілізавала творчую энэргію на барацьбу з ідэйнымі прарывамі на культурным фронце.

За манэўрамі, якія праводзіліся гомельскімі рабочымі Палесдруку з вялікай увагай сачылі Менскія асьветнікі, з тым каб іх удалы вопыт перанесьці на культурны фронт. На чале ініцыятывы праўленай перадавой часткай асьветнікаў г. Менску па правядзеньні манэўраў на культурным фронце сталі партыйны калектыў сумесна з ЦК Саюзу Беларрацасьветы, Камсамол і гарінспэктура Нарасьветы, якія пачалі праводзіць узмоцненую падрыхтоўчую работу па арганізацыйным афармленьні манэўраў.

Падрыхтоўчая работа была распачата 3 кастрычніка і закончана да 15 кастрычніка. Укамплектаваньне манэўраў культармейцамі пачалося самамабілізацыяй ударнікаў па зьлёце ударнікаў 10 кастрычніка.

Старт даны 16-кастрычніка пры ўдзеле 400 культармейцаў, прадстаўнікоў рабочых, партыйных, камсамольскіх арганізацый і чырвонаармейскай падшэфнай часьці.

МЭТАДЫ РАБОТЫ

Роты падзелены на асобных, маючых пэўныя галіны работы, камандах з выразна вызначанымі задачамі. Каманды прымацоўваліся для работы да школ і прадпрыемстваў.

Рота ўсеагульнага абавязковага першапачатковага навучаньня і ліквідацыі няпісьменнасьці выявіла 58 дзяцей, якія падлягаюць усеагульнаму абавязковаму навучаньню і павінны быць ахоплены школамі. Гэтыя дзеці не наведвалі школ па прычынах адсутнічаньня вопраткі і абутку. Камітэтамі садзейнічаньня пры школах закуплена з сродкаў на аказаньні дапамогі бяднейшым вучням абутак і адзеньне і 46 дзяцей ўцягнута ў школы.

У галіне ліквідацыі няпісьменнасьці неабходна было правесьці вучот няпісьменных і малапісьменных, а таксама выявіць работу ліквпунктаў, якія ў гэты час працавалі. На працягу трох дэкад рота выявіла няпісьменных 1616 чалавек і малапісьменных 2118 чал., з якіх 1365 не наведвалі ліквпунктаў і школ малапісьменнасьці. Значная частка ліквпунктаў працавала з вялікімі перабоямі, а некаторыя зусім не працавалі па віне ліквідатараў, зрываючых заняткі. Зараз працуе 154 ліквпункты, якімі ахоплена 1546 няпісьменных. Малапісьменных навучаецца ў школах малапісьменнасьці 2296 чал.

Рота праграм і падручнікаў, у задачу якой уваходзіла прааналізаваць як праграмы, так і падручнікі масавых школ, унесьці неабходныя карэктывы як у зьмесьце, так і аб'ёме праграм і падручнікаў і замяніць іх адпаведным навейшым матар'ялам. Вынікі работы роты па праверцы падручнікаў паказалі, што на гэтым фронце мелася значная ідэалёгічная ўстаноўкі і шмат яўных выступленьняў клясавага ворага (Лёсік—падручнік па беларускай мове).

Рота дашкольнага выхаваньня на працягу першых трох дэкад манэўраў распрацавала пляны работ дашкольных устаноў. Да манэўраў з агульнай колькасьці дашкольных устаноў мелася толькі ў трох установах гадавы арыэнтоўныя пляны. У выніку работы роты, у якую было ўцягнута 135 дашкольніц, усе дашкольныя ўстановы маюць як гадавыя арыэнтыровачныя, так і паквартальныя пляны работ. Апрача гэтага на прадпрыемствах горада ўтворана вячэрніх пакояў—11, дзіцячых садоў—8, на 14 груп, дзіцячая пляцоўка—1 і разьмеркавана на сёлах 40 чал.

Ротай утвораны пры Доме Чырвонай арміі 7-мі месячныя курсы дашкольных работніц на 50 чал. Работа праводзіцца па грамадзкіх пачатках. Ротай абслугоўваюцца утворанымі курсы дашкольніц, а таксама арганізаваны грамадзкі інструктаж дашкольніц у 3-х вясковых раёнах.

Рота інтэрнацыянальна-клясавага выхаваньня вывучала становішча работ па інтэрнацыянальна-клясавым і антырэлігійным выхаваньні ў школах. Рота канстатавала, што інтэрнацыянальна-клясавае і антырэлігійнае выхаваньне вучняў у школах, за рэдкім выключэньнем, было пастаўлена дрэнна. Мелася выпадкі праяў у школах закуплена з сродкаў на аказаньні дапамогі нізму, антысэмітызму, контррэвалюцыйнага нацдэмакратызму і інш.

Рота ў сваёй практычнай рабоце па вывучэньні стану інтэрнацыянальна-клясавага і антырэлігійнага выхаваньня ў школе дала канкрэтныя паказаньні на наладжваньні работы ў гэтых арганізацыях і аказала практычную дапамогу ў іх рабоце. Рота вынесла на абгаварэньне пытаньне аб інтэрнацыянальна-клясавым і антырэлігійным выхаваньні на сходы рабочых, завастрыўшы ўвагу на неабходнасьць большай сувязі школ з прадпрыемствамі, дапамогі апошніх школам па камуністычным выхаваньні дзяцей.

Рота палітэхнізацыі вяла работу ў частцы наладжваньня сувязі школ з прадпрыемствамі. У выніку работы гэтай роты выяўлена, што значная частка школ з прадпрыемствамі зьвязана ня была, альбо была зьвязана фармальна. На працягу першых трох дэкад работы было пастаўлена больш 30 дакладаў на прадпрыемствах аб сутнасьці палітэхнізацыі школ, вылучаны прадстаўнікі ад рабочых 8-мі прадпрыемстваў, 6 прадпрыемстваў узялі на сябе абавязацельствы арганізаваць рабочыя куткі, 10 прадпрыемстваў абсталяваць майстэрні і лябораторыі пры школах, 6 прадпрыемстваў—арганізаваць дзіцячыя вучэбна-вытворчыя цэхі. Зараз наладжана работа вучняў 22 школ на прадпрыемствах, 9 школ заключылі сацыялістычнае спаборніцтва паміж прадпрыемствамі і школамі.

Вось тыя вынікі, якія далі культманэўры па гор. Менску. Гэтыя вынікі атрыманы толькі таму, што асьветнікі гор. Менску пры актыўным удзеле рабочых мас і належным падтрыманьні ўсёй савецкай грамадзкасьці, пад кіраўніцтвам партарганізацыі здолелі вырашэньне пытаньняў культурнай рэвалюцыі паставіць на бальшавіцкія тэмпы.

Атрыманыя дасягненьні на фронце культурнай рэвалюцыі па г. Менску—удар па клясавым ворагу, яго агентуры правых і «левых» апартуністаў, беларускіх контр-рэвалюцыйных нацдэмах і—моцны ўклад у справу беларускай культуры нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зместу.

Уступаючы ў трэці рашаючы год пяцігодкі Менскія асьветнікі пад кіраўніцтвам ленінскай партыі будуць і надалей змагацца за ўдарныя тэмпы культурнай рэвалюцыі.

Няхай жыве КП(б)Б.

Няхай жыве культурная рэвалюцыя.

Штаб Менскіх культманэўраў.

У Прэзыдыуме ЦВК БССР

На апошнім пасяджэньні Прэзыдыуму ЦВК БССР, якое адбылося пад старшынствам тав. А. Г. ЧАРВЯКОВА, былі разам з іншымі разгледжаны наступныя пытаньні:

Аб ходзе справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў БССР

Заслухан даклад Цэнтральнай выбарчай камісіі аб ходзе справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў.

Справаздачна перавыбарчая кампанія саветаў ня гледзячы на некаторыя добрыя паказчыкі (павялічэньне яўкі выбаршчыкаў на сходы, павялічэньне партыйнага і рабочага ядра і ліку жанчын у складзе саветаў) усё-ж праходзіць нездавальняюча. Справаздачна-перавыбарчая кампанія не пастаўлена ў цэнтры ўвагі іншых кампаній. Згодна тых даных, якія маюцца (на 28-XII—30 г.) па БССР праведзены перавыбары па 330 саветах; яўка выбаршчыкаў на сходы складае 65,12 проц., яўка жанчын—55,24 проц. Усяго выбрана ў члены саветаў 12.469 асоб, з іх жанчын 21,69 проц. камуністых 10,62 проц., камсамольцаў 6,19 проц.

Найбольш адсталымі раёнамі ў сэнсе яўкі выбаршчыкаў зьяўляюцца: Гарадоцкі, Сіроцінскі, Аршанскі, Боркавіцкі. Адстаюць у справе выбараў жанчын у склад саветаў раёны: Гарадоцкі, Сененскі, Заслаўскі, Жыткавіцкі і інш. У найбольш адсталыя раёны былі пасланы для дапамогі цэнтральныя работнікі, а таксама і больш брыгад. У цэнтралізаваным парадку было пасланы для дапамогі ў правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі 1396 чал., акрамя таго шэфскія арганізацыі накіравалі на свае лініі на месцы шэраг работнікаў.

У некаторых раёнах слаба завострана ўвага на барацьбу з правапартуністычнай практыкай саветаў і пасобных выканкомаў (Чарэйскі, Копыльскі і інш.).

Прэзыдыум ЦВК прыняў па дакладу адпаведную пастанову, якая была апублікавана ў друку.

Аб становішчы сувязі з раёнамі.

Прэзыдыум ЦВК заслухаў даклад Намесьніка Ўпаўнаважанага Наркампаштэля тав. Каменева аб становішчы сувязі з раёнамі.

Становішча сувязі зьяўляецца нездавальняючым у параўнаньні з тымі запатрабаваньнямі, якія ўзьнікаюць у зьвязку з пераходам на непасрэднае раённае кіраўніцтва. Паштовай сувязьзю сельскае насельніцтва ахоплена на 85 проц., райвыканкомы і сельсаветы на 100 проц. Ад цэнтру ў раёны пошта ходзіць 5 раз у тыдзень. Унутраны паміжраённы рух пошты—па тэрыторыі былых 4-х округ пошта ходзіць 4 разы ў тыдзень і па 3-х былых округах—3 разы ў тыдзень. Зусім нездавальняючая справа з рухам пошты па трактах. У адносінах дастаўкі газэт ёсьць шэраг недахопаў—часткова па віне пошты, часткова-жа па віне рэдакцый газэт. Становішча электрычнай сувязі з тэхнічнага боку здавальняючае, аднак, яе пабудова ў свой час была ў большасьці выпадкаў дапасавана на сувязь з акруговымі цэнтрамі. На 1931 г. намечан капітальны рамонт тэлеграфных і тэлефонных ліній. Тэлеграфную сувязь Менск мае толькі з 19 раёнамі, непасрэдную тэлефонную сувязь з 25 раёнамі, трансляцыі—з 33 раёнамі і прыёмнікамі—з 41 раёнам. Цэльная тэлефанізацыя маецца па 17 раёнах. У горадзе Менску заканчваецца пабудова аўтаматычнай станцыі, намечана пабудома такіх-жа станцый і ў іншых буйных гарадох. Усе рацыі ВСНГ забясьпечаны радыёўстаноўкамі, але работаюць яны нездавальняюча. Наркампаштэлям намечан шэраг мерапрыемстваў па падрыхтоўцы кадраў сувязі.

Прэзыдыум ЦВК ухваліў мерапрыемствы Ўпаўнаважанага Наркампаштэля па будаўніцтву сувязі, накіраваныя на тое, каб на працягу 1931 году зьвязаць усе раёны тэлеграфнай і тэлефонай сувязьзю і сельсаветы—тэлефонай сувязьзю. Прэзыдыум ЦВК прызнаў неабходным у найкарацейшы тэрмін устанавіць радыё-сувязь з усімі раёнамі. Райвыканкомам і сельсаветам даручана зьвярнуць увагу на сталае кіраўніцтва работай аддзелаў сувязі на мясцох. Да сканчэньня перабудовы Менскай тэлефоннай станцыі прызнана неабходным устанавіць дадатковую падстанцыю на 600 нумароў.

Стварэньне лінейнага чыгуначнага суду.

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў арганізаваць на тэрыторыі БССР пры Ўпаўнаважаным Народнага Камісарыяту Шляхаў Зносін лінейна-чыгуначны суд і Пракуратуру па транспарту. Пракурорам па транспарту будзе адзін з памоцнікаў Пракурора Рэспублікі, а старшынёй лінейна-чыгуначнага суду—адзін з членаў Вярхоўнага Суду БССР. Прэзыдыум ЦВК таксама зацьвердзіў сьпіс народных засядацеляў для лінейна-чыгуначнага суду ў ліку 61 асобы.

Новыя члены Вярхсуду БССР.

Прэзыдыум ЦВК назначыў т. т. Грыгарчука В. А., Шыфрына Р. А., Кіша Я. Я., Ігнатава Л. М. і Зайцава Я: А. Членамі Вярхоўнага Суду БССР.

Аб укамплектаваньні вайсковых навучальных устаноў.

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў Цэнтральную вярбовачную камісію па ўкамплектаваньні вайсковых навучальных устаноў у наступным складзе:

Т. т Васілевіч (Старшыня камісіі), Лубаўцоў, Гальмінток, Навасёлкаў, Шэцкін, Маслакоў і Гузікаў.

Раённым выканаўчым камітэтам і гарсаветам, вылучаным у самастойныя адміністрацыйна-гаспадарчыя адзінкі, даручана зараз-жа вылучыць раённыя і гарадзкія вярбовачныя камісіі.

ЗАКОНЫ І ПАСТАНОВЫ УРАДУ БССР

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

ПРА НАЗНАЧЭНЬНЕ Т. ШАСТАКОВА, М. Л., ЧЛЕНАМ ПРЭЗЫДЫУМУ ДЗЯРЖПЛЯНУ.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

Назначыць т. Шастакова Мікалая Лар'явіча, членам Прэзыдыуму Дзяржаўнай Плянавай Камісіі пры СНК БССР.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР

М. Галадзед

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР

М. Калевіч.

28 сьнежня 1930 г.
г. Менск.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

ПРА НАЗНАЧЭНЬНЕ Т. КАМЕНШТЭЙНА ЧЛЕНАМ ПРЭЗЫДЫУМУ ВСНГ БССР.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

Назначыць т. Каменштэйна членам Прэзыдыуму Вышэйшага Савету Народнай Гаспадаркі БССР.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР

К. Бэнэк

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР

М. Калевіч.

23 сьнежня 1930 г.

ХРОНІКА

Як праходзіць культэстафэта.

Фініш культэстафэты па БССР адтэрмінаваны да 23 студзеня 1931 году (ленінскі тыдзень).

У хуткім часе Наркамасьветы выпускае ліст да ўсіх настаўнікаў і райінспэктароў аб разгортваньні працы культэстафэты ўдарнымі тэмпамі з тым, каб з належным вынікам прыйсьці да фінішу.

Наркамасьветы зварочвае ўвагу ЦСПСБ на тое, што прафсаюзныя арганізацыі амаль ня прымаюць удзелу ў правядзеньні культэстафэты.

Палітэхнізацыя школ.

На апошнім пасяджэньні калегіі Наркамасьветы быў заслуханы даклад аб выніках абсьледваньня становішча палітэхнізацыі школ.

Адзначана, што асабліва ў вясковых раёнах і першапачатковых школах справа рэарганізацыі школы на палітэхнічных пачатках пастаўлена надзвычайна дрэнна.

Выходзячы з гэтага, калегія пастанавіла: у хуткім часе выпусьціць ліст да кіруючых раённых арганізацый аб зварочваньні максымальнай увагі на палітэхнізацыю школ.

ПЛЕНУМ ВСФКБ.

На гэтых днях у Менску адбыўся пленум Вышэйшага Савету Фізкультуры. Пленум абгаварыў і прапрацаваў становішча і прыстасавальасьць асноўных галін фізкультурнага руху ў БССР да асноўных сучасных задач, стаячых перад савецкай краінай, у галіне разьвіцця сацыялістычнай прамысловасьці і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Пленум ВСФКБ канстатуе адсутнасьць удзелу і дапамогі ў працы пленуму і ў фізкультурнай працы з боку Наркампрацы, ВСНГ, Калгасцэнтру, саюзу с.-г. лесарабочых, НКЗему, Галоўпалітасьветы ТДА Авіяхэму, Белкаапсаюзу і рэдакцыі газэт.

Клюбнае будаўніцтва ў Менску.

У 1931 годзе ў Менску будуць пабудаваны новыя рабочыя клюбы: шэйнікаў, будаўнікоў, гарбароў.

На пабудову клюбу шэйнікаў адпушчана 450.000 руб. на пабудову клюбу будаўнікоў—480.000 руб. і на пабудову клюбу гарбароў—370.000 руб.

Паштовая скрынка

М. Піскуну—«Лістапад рашаючы месяц», Агапаву—«Прасьпект сапэрнай работы»—аб гэтым друкавалася. Асакке—«Зьняць апартуністычнае кіраўніцтва Галацкага сельсавету. Устаў на пойдзе.

Я. Зуевічу—«Бабінавіцкі сельсавет па перавыбараў падыходзіць з наступнымі вынікамі», трэба пісаць ня гонымі вынікамі, а высьвятліць практычны лічбы, а высьветліць практычны вопыт работы. А. Д.—«У дэкаду абароны»—няма фактаў, да друку ня пойдзе.

А. Лосю.—«Мабілізацыя сродкаў у аснову працы», пішэце як за кастрычнік і лістапад вы выканалі заданьне. А. Левіну—«Мабілізацыя сродкаў па спажывецкай кааперацыі праходзіць марудна», Барабанаву—«Аб рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка ў чатыры гады», Шчакалову—«Плятуцца ў хвасьце», А. Л-оў — «Бязьдзейнасьць крэдытных устаноў зрывае абмен», да друку ня пойдуць, матар'ял устарэў. А. Зоркаму—«Мабілізацыя сродкаў з пасельніцтва», ня пойдзе, няма фактаў.

Гаўрыленку—«Кулацкая маскіроўка» пасланa на досьлед Жлобінскаму Райкалгассаюзу. Утману—«Прахаджэньне бульбанарыхтоўкі» — Петрыкаўскаму РВК. Свайму—«Кулак у пашане»—Заслаўскаму РВК. Зоркаму—«Аб калгасе «Чырвоны барацьбіт»—Самахвалавіцкаму Райкалгассаюзу.

Ус—«Шкодная думка» накіравана Аршанскаму Райкому КП(б)Б. Новікаву—«Шкодніцтва ў калгасе «Чырвоны пахар»—Буда-Кошалёўскаму пракурору. Вераску—«Ударыць па шкодніках»—Карэлінскаму Райкалгассаюзу.

Л-р.—«Дарагія анэкдоты» пасланa на расьледваньне Чэрвеньскай РайРСІ. Некалагасіліку—«Падта кепска» і чыстцы ў калгасе «III Інтэрнацыянал»—Клімавіцкаму Райкалгассаюзу. Воку—«Выслужць шкодніка»—Гомальскаму Райкалгассаюзу. Мазыркаму Райкалгассаюзу. Грамабою—«На шляху адставаньня»—Бярэзінскаму Райкалгассаюзу. Вайніловічу—«Аб калгасбудаўніцтве» — Заслаўскаму Райкалгассаюзу.

Вішні—«Спадзяюцца на саманёк», П. Я.—«Зрабіць пералом», Крушыне—«Б'ём галкінія плётні аб разьмерк. ці гіне збожжа», Лішчарэю — «Як прайшло разьмеркаваньне прыбыткаў»—допісы зьмешчаны ня будуць, не надыходзіць.

Прыбытку—«Лічбы кажуць, а факты падмацоўваюць», Савельеву—«Асеньня пасеўная і ўборачная кампанія», Буркуну—«Рабочыя ударнікі»—позна друкавацца ня будзе.

А. Зодкаму—«Пухавіцкае Райпо ўстанаўляе свае законы»—накіравана Белкаапсаюзу. Хадыку — «Глушыце і самакрытыкі»—ЦП саюзу медсанпрацы.

Апавяшчэньні

Запрашаюцца працаўнікі Дзяржпляну, ВСНГ, НКЗему і іншых гаспадарчых устаноў, навуковыя працаўнікі, члены т-ва аграрнікаў-марксыстых, студэнты і аспіранты.

с 1 студзеня, а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні Камвузу (Університэцкая 27) адбудзецца сход Таварыства Гісторыкаў-марксыстаў.

На павестцы дня: «Працяг спрэчак па дакладу тав. Матулайціса аб [illegible]».

Праўленьне.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

1-і а 7 гадзіне ўвечары адбудзецца агульны сход 7-га групкому.

Яўка членаў групкому абавязкова.

Да ўсіх [illegible] гор Менску рабочых арганізацый

Орг. Камісія ЦК [illegible] у ВНУ і тэхніку-гарадзкой канфэрэнцыі [illegible] дамляе,

гарадзк. канфэрэнцыя і чыстцы адчыняецца 1-га студзеня [illegible]

а 6-й гадзіне ўвечары ў п[illegible] клюбу „Харчавікоў" (пог Ка[illegible]ская і Інтэрнацыянальная)

Орг Камісія Я[illegible]

Адказны рэдактар П. ША[illegible]

Да ведама дэлегатаў Зьезду—Арг. Камісія паведамляе, што X-ы ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД ЛКСМБ адчыняецца 5-і 1931 г. ў памяшканьні Дзяржтэатру а 6-й гадзіне ўвечары. Мандаты будуць выдавацца ў памяшканьні ЦК ЛКСМБ з 5-га студзеня 1931 г. з 10-ці гадзін раніцы да 4-х гадзін увечары, а з 4-х гадзін у Дзяржтэатру.

Дэлегаты гор. Менску павінны атрымаць мандаты 4-га студзеня з 10-ці гадзін раніцы да 9-ці гадзін увечары ў памяшканьні ЦК ЛКСМБ (вул. Карла Маркса 3).

Па ўсіх даведках зварачацца ў Арг. Камісію па тэлефонах 8-11 і 1-13.

Старшыня Камісіі РЫНДЗІЧ.

1-га студзеня 1931 году а 7 гадзіне ўвечары ў [illegible]ме асьветы (Камуністычная 19) адчыняецца Першая Ўсебеларуская партыйна-камсамольская і прафсаюзная канфэрэнцыя па пытаньні дзіцячага камуністычнага руху. Уваход па мандатах і гасьцявых білетах.

ЦБ ДКА ЦК ЛКСМБ.

ТЭАТР- [illegible]

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"	Сёньня і штодня I. 2-я і апошняя серыя БЯЗБОЖНІЦА у 6 частках. II. Новы гукавы фільм у 2 х частках „С РАКАВЫ МАЙ" Пачат к а 6 гадзіне Штодзённа 4 сеансы.)—(Каса адчынена ад 5 гадз
Кіно-тэатр „Культура"	З панядзелка 29 сьнежня новы фільм „Шчасьлівы Кзит" драма 6 частках. Ш оаны З. эля ь.
Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"	З па я ел а 29 сьнежня г стар'ачны рам н „Паэт і цар" ачатак а 6 а з. Каса а 4 з пал. гадз
Кіно „ПРАЛЕТАРЫЙ"	БЭСТАР КЭТОН у ленні й з межнай фільме „З ЭПОХІ З" ачатак а 6 гадз. аса а 4 э н л г дз.
Дзіцяч кіно-тэатр „ЮНЫ ПІЯНЭР"	З панядзе ка 29 сьнежня 1) мас ацкі фільм „АНЯ ГАЙ" д ама ў 6 частках. 2) Культф льм „МАЛПА КАВІАН" Пачата а 1-й га зіне Каса а 12.

АПАВЯШЧЭНЬНЕ

Гэтым даводзіцца да ведама спажыўцоў будаўнічых матар'ялаў, што згодна з пастановай Прэзыдыуму Дзяржпляну БССР ад 21-XII—30 г., усе рэспубліканскія фонды лесапродукцыі на будаўніцтва, выдзеленыя Дзяржпляном СССР для Беларусі, перададзены Белдзяржснабу (б. Белпайторг).

Усе ведамствы, уключаныя Дзяржпляном БССР, у сьпіс спажыўцоў лесапродукцыі (пратакол ад 21-XII—30 г.), абавязаны падаць Белдзяржснабу свае разнарадкі на працягу 3-х дзён з дня абвяшчэньня гэтага. У разнарадку павінна быць паказана—дакладны адрас атрымальніка ст. прызначэньня, або месца атрыманьня, хто зьяўляецца платнікам, праз які банк і № кантакарэнтнага рахунку.

Ведамствы—Наркаматы і Аб'яднаньні, не падаўшыя сваіх разнарадак у вызначаны вышэй тэрмін, ня будуць уключаны у плян забясьпечаньня матар'ялам на студзень месяц.

На падставе той-жа пастановы Дзяржпляну БССР, будаўніцтвы раённых выканкомаў і камітэтаў (школьнае, больніччае і камунальнае) здавальняецца у цэнтралізаваным парадку, праз адпаведныя наркаматы, а шляхавае будаўніцтва—праз Галоўдортранс, якім выдзяляюцца фонды.

Здавальненьне драўнінай у гатовым відзе раённага як і ідогул усяго будаўніцтва ўтвараецца лесрамгасамі толькі на атрыманьні адпаведных нарадаў Лесазбыту, Лесбелу. Такія нарады Лесазбыт выдае Лесрамгасам па разнарадках Белдзяржснабу.

У выпадку, калі лесасечны фонд сельскага сэктару (мясцовае насельніцтва і калгасы) на ўзгадненьні РВК з Лесрамгасамі перадаецца апошнім для распрацоўкі, дык гэта драўніна у гатовым выглядзе адпускаецца сельсэктару без нарадаў Лесазбыту, Лесбелу ў межах норм, выдзеленых лескамісіямі пры РВК.

Аддзел збыту лесбелу АРДАШНІКАЎ.

Белдзяржснаб ЛУЦКЕВІЧ.

Больш увагі ільну

1931 год павінен стаць пераломным у справе разьвіцця ільнаводзтва. За апошнія гады ільнаводзтва на тэрыторыі БССР значна пашырылася. Так, калі ў 1914 г. пад ільном было 94.540 га. у 1923 г.—71.130 га, у 1926 г. — [illegible] а ў 1930 г. 156.200 га. Такім чынам [illegible] пад ільном у менш 20-25 проц. [illegible] ня [illegible] ад усёй пасеўнай плошчы. Адпасобны сэктар таксама павінен пайсьці ў нагу з калгасамі і значна пашырыць пасеў ільну. У гэтай справе ім дапаможа ільна-канапляводчая кааперацыя.

Глыбокая спэцыялізацыя сельскай гаспадаркі ільнаводных раёнаў, значнае пашырэньне пасеўных плошчаў пад ільном, змогуць быць праведзены пры ўмове наданьня дастатковай увагі гэтай справе з боку цэнтральных і мясцовых устаноў з прыцягненьнем грамадзкасьці. Найбольш адказная роля ў гэтай справе выпадае на долю раённых арганізацый Райза, Райкалгас саюзы і Райільнакапляводсаюзы як непасрэдныя кіраўнікі сельска - гаспадарчай вытворчасьцю, павінны надаць гэтай справе максымум увагі. У сувязі з караной перабудовай сельскай гаспадаркі ў напрамку яе спэцыялізацыі, паказаныя арганізацыі павінны перабудаваць усю сваю штодзённую работу з мэтаю найбольш поўнага абслугоўваньня вядучай галіны сельскай гаспадаркі ў ільнаводных раёнах ільнаводзтва.

Спэцыялізацыя павінна зрабіцца маставай кампаніяй. Пытаньні спэцыялізацыі раёнаў і пасобных гаспадарак (саўгасаў і калгасаў) павінны быць падрабязна прапрацаваны раённымі органі зацыямі і даведзены для абгаварэньня ў сельсаветы, саўгасы, калгасы і ў працыцельныя каапэрацыйна-вытворчыя аб'яднаньні. Кожны рабочы саўгасу, кожны калгаснік, уся бяднякоцка-серадняцкая маса сялянства павінны добра разумець увесь сэнс гэтага мерапрыемства.

Перад мясцовымі органамі зараз стаіць задача--правесьці шырокую растлумачальную работу аб спэцыялізацыі раёнаў, ператварыўшы гэту работу ў грамадзка-палітычную кампанію. Неабходна мабілізаваць грамадзкасьць навокал пытаньняў спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі. Трэба разгарнуць сацыяборніцтва паміж саўгасамі, калгасамі і каапэрацыйна-вытворчымі аб'яднаньнямі на выкананьне дырэктыў партыі і ўраду аб спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі з тым, каб зрабіць каранны пералом у справе разьвіцця ільнаводзтва ўжо ў вясновую пасеўную кампанію 1931 г.

Г. М.

Толькі ў трэцім месяцы была затрымка

[illegible]

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА

Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх дэпутатаў № 79

гор. Менск 29 сьнежня 1930 г.

аб забароне ўбою коняй

Менскі Гарадзкі Савет Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў пастанаўляе:

1. Забараніць убой коняй, годных для працы, а таксама конскага маладняка незалежна ад таго каму яны належаць.

2. Дазволіць убой коняй і конскага маладняка толькі пры наяўнасьці ў іх такіх недахопаў і хвароб, якія робяць іх нягодным для гаспадаркі, або лячэньне якіх не апраўдывае затрат.

3. Вызначэньне гаспадарчай нягоднасьці коняй і конскага маладняка для забою іх робіцца у кожным асобным выпадку Камісіяй у складзе: прадстаўніка Гарадзкога Савету, або прыгароднага сельсавету, ветдоктара і прадстаўніка ад загатоўчай арганізацыі.

4. Асобы вінаўныя у парушэньні гэтай абавязковай пастановы, згодна з пастановай ЦВК СССР ад 1-XI—1930 г. «Пра мерапрыемствы супроць дрэнніцкага убою жывёлы» (Известия ЦИК СССР и ВЦИК за 20-XI—1930 г. № 319), падлягаюць адказнасьці: а) службовыя асобы дзяржаўных, кааперацыйных устаноў і прадпрыемстваў—крымінальнай адказнасьці, б) прыватныя асобы—штрафу у адміністрацыйным парадку да 10 кратнай каштоўнасьці забітага каня па мясцовай загатоўчай цане, в) кулакі і прыватныя куплічыкі прыцягваюцца да крымінальнай адказнасьці з канфіскацыяй маючыхся ў іх коняй і маемасьці.

5. Нагляд за выкананьнем гэтай абавязковай пастановы ўскладаецца на гарадзкую міліцыю, прыгарадны сельсавет і ветнагляд.

6. Гэтая абавязковая пастанова ўваходзіць у моц з часу апублікаваньня.

Старшыня Менгарсавету Аксючыц.
Сакратар Пасынкоўскі.

Апавяшчэньні

Камісія па п аверцы і чыстцы устаноў Наркампрацы, Галоўсапстраху, інстытуту аховы працы. Устаноў а (ЦІП)

АБ Я Ш Ч А Е,

што з 27 сьнежня г.-г.

установлены дзяжурствы членаў цэнтральнай камісіі кожны дзень з 9 г. да 5 гадзіны і з 6 г. да 9 г. увеч. Тэлефон № 8-16.

ЗГУБЛЕН

прад'яв цельскі чэк,

выданы Стара Дарожскім раённым грашовым аддзелам 25-XII—30 г. за № 119 на прадмет атрыманьня Старадарожскага адзяленьня Дзяржбанку 754 руб. (емсот пяцьдзясят чатыры), а таксама ашчадная кніжка, выданая Старадарожскай п ч канторай, за № 81 —на прадмет атрыманьня 15 руб. на імя Л. І Фрумкіна.

Згубленыя дакумэнты лічыць не сапраўднымі

Смалянскі Тэхнікум Сацземляробства

ПРЫЕМ ЗАЯЎ

на аддзяленьні па ба ацьбе са ШКОДНІКАМІ сел.-г. сп.

ПРАЦЯГНУЎ ДА 10-га СТУДЗЕНЯ 1931 г.

Умовы прыём аб'яўлены газ. „С. Б." ад 12-XII і 13-XII—1930 г.

Беларускае Аддзяленьне А. Б Ш

ЗАВОЧНЫ ПЭДФАК БДУ

з 15-га студзеня па 1-га лютага 1931 году праводзіць

лябараторна-практычныя заняткі і залікі

з студэнтамі-завочнікамі 1 прыёму 1929 г.

Усе студэнты-завочнікі павінны зьявіцца на залікавую сэсію з кантрольнымі працамі і іншым матар'ялам, які быў распрацаваны на працягу 1929 30 навучальнага году.

Аб гэтым кожнаму студэнту асабіста пасланa абвяшчэньне.

БЮРО.

Всем членам МОПР'А Всем ячейкам МОПР'а

Растет белый террор в странах капитала и кое-где

Тысячи борцов за мировую революцию томятся в тюрьмах капитала.

Выполняйте ваш интернациональный долг вносите своевременно членские взносы Берите шефство над узниками капитала

Ячейки МОПР! Не вносите деньги через почтово телеграфные учреждения в адрес своего краевого или областного комитета МОПР

По мопровским переводам почта деньги пересылает бесплатно Не задерживайте у себя денег, сдавайте на почту.

Центральный Комитет МОПР СССР.

Катэдра палітычнай эканоміі ф-ту нар. гаспбуду

1-га студзеня 1931 г. а 6½ гадз. вечарам у аўд. 317. (галоўны корпус БДУ) адбудзецца працяг дыскусіі на тэму:

«ЧУЖЫЯ ЎПЛЫВЫ Ў НАВУКОВЫХ ПРАЦАХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ Ф-ТУ НАР. ГАСП. БДУ».

Катэдра запрашае ўсіх студэнтаў і навуковых працаўнікоў.

Ліквідкамісія был. Васход—Янапольскай сельскагаспадарчай арцелі Елагінскага с-с. Віцебскага раёну, паведамляе, [illegible] ліквідаваных [illegible] Установы, што усялякага роду прэтэнзіі да арцелі «Янаполь» прымаюцца да 5 студзеня 1931 году. Пасьля паказанага тэрміну [illegible] прыймацца ня будуць.

Ліквідкамісія.

ЗГУБЛЕНЫ:

Пашпарт Хургеля А—Д З.—выд. 4-м Аддз. Менакрміліцыі, кв. № 540.

Мэтрычная даведка Кагана А. М. [illegible] Асбоўскім [illegible] 1914 г. Юрэвіча нарадж. 1911 г. у в. Хатайнічы Пін[illegible] А. выд. [illegible] ВССР, [illegible]ніцкага р-ну, кв. № 489.

[illegible] Юркевіча І. К. выд. Сен. К[illegible] Службы Цяпіна № 7-10, кв. № 494.

[illegible] 1) Вайсковы білет, выд. Узьдзенскім Ваенкаматам, 2) паявая і [illegible]ная кніжка, выд. Узьдзенскім спаж. саюзам. [illegible] і т-вам на імя Чыкуча Ул., кв. № 496.

Членская кніжка Вадавозава В. А. і кніжка касы ўзаемадапамогі, выд. [illegible] Саўгаддзьслужачых, кв. № 497. № 500.

Мэтрычны выпіс Усан К. М.—выд. Полацкім АВК, кв. № 492.

Членская кніжка № 18608 Юркевіча І. К.—выд. саюзам чыгуначнікаў, кв. № 493.

Камсамольскі білет Кац С. Д.—выд. Арцёмаўскім Райкомам КСМ, кв. № 498.

ПРЭЗІДЭНТСК